КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №1 (129)
◂ 16 СТУДЗЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ЙІРЖЫ КАРАС: «Я ВЕРУ, ШТО БЕЛАРУСЬ СТАІЦЬ НА ПАРОЗЕ ВЯЛІКІХ ПЕРАМЕН»**

Стар. 4

**ВАЙНА: ДЗВЕ ПРАЎДЫ**

Стар. 5

**СУПРАЦІЎ: ЗА І СУПРАЦЬ**

16 студзеня ў сусветны пракат выходзіць фільм «Супраціў» («Defiance») рэжысёра Эдварда Цвіка. Падзеі ў карціне адбываюцца ў Беларусі падчас другой сусветнай вайны.

Стар. 11

**ІГНАТ ДАНІЛОВІЧ. З МІЛАСЦЮ ДА ГІСТОРЫІ**

Першая палова XIX стагоддзя ў еўрапейскай грамадскай свядомасці была часам панавання рамантызму, што надаваў ўвагу мінуўшчыне, у якой рамантыкі шукалі прыклады гераічнага жыцця.

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Марыі Мартысевіч**

**«Франачак»**

**З цыклу «Новая генерацыя»**

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ПА ЗАМКНЁНЫМ КОЛЕ

*Аляксей КАРОЛЬ*



**За 5 хвілін да Новага года беларускі народ пачуў кодавыя віншавальныя словы — пра поспехі, адсутнасць крызісу, стабільнасць, росквіт і светлую будучыню. А роўненька праз суткі атрымаў і галоўны навагодні падарунак — дэвальвацыю нацыянальнай валюты на 20 з каптуром адсоткаў. Сюрпрыз што трэба. Як у той рэкламе: «Шок — гэта па-нашаму». Уздыхнуць — не выдахнуць.**

Пра эканамічныя складнікі і магчымыя наступствы гэтага падарунка — блізкія і аддаленыя — эксперты ўжо сказалі ўсё што маглі. Адчуў іх на сабе ўжо і сам народ. Серыял толькі пачынаецца. Працяг будзе. Рэаліцішоу можна выключыць па тэлевізары, але, на жаль, не ў жыцці. У жыцці яго можна толькі пераадолець. Іншая справа — як і калі? З выхадам куды — на магістральны шлях да лепшага жыцця ці зноў па зачараваным коле? І тут без асэнсавання палітычных складнікаў працэсу, што выявіліся на лязе дэвальвацыі, не абысціся.

На дысплеі памяці ўсплываюць карцінкі пярэстых 1990-х. Гучныя дэкларацыі пра рэформы і іх блакіроўка старой-новай наменклатурай на справе. Пустыя заявы і абяцанкі. Дэвальвацыі, дэнамінацыі, інфляцыя, дэфолт. Застылыя прадпрыемствы. Бурлівы парламент. Стыхія мітынгаў і дэманстрацый. Квітнеючая бюракратыя. Змораны народ. Выбары. Прэзідэнцкія. Першыя, другія і трэція. Народ галасуе за «свайго». Палітычны навабуд па-беларуску — на ўзор былой савецкай аднаасобнай сістэмы ўлады.

Стомлены народ прымае, а то і вітае новы парадак. І не звяртае ўвагі, як адзін за адным адключаюцца, падмяняюцца імітацыяй рычагі, праз якія ён мог сапраўды ўплываць на сітуацыю. Свабодныя выбары і вулічныя акцыі, незалежныя СМІ, паўнавартасны парламент, шматпартыйнасць, грамадскія аб'яднанні. Амаль поўная адсутнасць рэакцыі грамадства на рэпрэсіі і перанслед. Бо жыццё ж сапраўды быццам бы паляпшаецца і стабілізуецца.

Аднак адкуль рэсурс? Адказ на гэтае пытанне і выявіў з відавочнасцю абвал рубля першага дня 2009 года: з Расіі, ад 6 да 8 мільярдаў у год. І разам з тым выявіў значна большае: палітычную вычарпанасць беларускай сістэмы ўлады. Гэта не кіраўнік «Беларусь Інкарпарэйтад» вынайшаў геніяльны ход, як даіць Расію. Гэта маскоўскі Крэмль, па свайму імперскаму мысленню, успрымаў Беларусь не інакш як неад'емную частку Расіі. А магчыма, і істотна паспрыяў рэалізацыі адпаведнага палітычнага праекта ў Беларусі. І таму ўзяў, у поўнай адпаведнасці з савецкай традыцыяй, на датацыйнае ўтрыманне.

І вось — абвал, які і выявіў галоўнае: рэсурс трываласці вычарпаны. Той самы рэсурс, якім валодаў савецкі таталітарны рэжым СССР і які атрымаў новае ўвасабленне ў адной, асобна ўзятай, беларускай аўтарытарнай мадэлі. Яго хапіла, з улікам знешніх ін'екцый, на паўтара дзесяцігоддзі. Гэтыя б датацыі ды на стварэнне сучасных эканамічнай ды палітычнай сістэм.

Беларуская ж кіроўная эліта правяла Беларусь па коле на мяжу пачатку 1990-х гадоў. Іх уласная праграма, сарамліва вызначаная як праграма пераадолення часовых цяжкасцей, вядома ж, выкліканых «бандыцкім» крызісам у заходніх краінах, з усёй відавочнасцю выкрывае зваротнасць гэтага маршу назад. Усе прапанаваныя імі меры выратавання эканомікі з набору рэформ пачатку 90-х. Іншая справа — іх змест і паслядоўнасць.

Аднак у аўторак прагучалі яшчэ і крамольныя словы пра лібералізацыю эканомікі. Нават з вуснаў кіраўніка дзяржавы. Яго адказы на пытанні журналістаў на Камунмашы можна б было лічыць абвяшчэннем праграмы рэформ зверху, каб не іх унутраная супярэчлівасць, не адмаўленне адным тэзісам другога. І яшчэ антураж: вялізны цэх, дзе толькі купка журналістаў і ніводнага рабочага. Каб не задалі сваіх пытанняў?

Аднак толькі імітацыяй перамен дзеля атрымання крэдытаў на Захадзе, дзеля манеўра паміж Расіяй і Захадам ужо не абысціся. Сітуацыя вымушае. Атрыманых крэдытаў хопіць на першы час. А што потым? У намерах кіроўнай групоўкі і звязанага з ёю бізнесу лёгка прачытваецца адно памкненне: любой цаной захаваць уладу і ўласны капітал. Лібералізацыя эканомікі, але не дэмакратызацыя палітычнай сістэмы. З дапушчэннем пэўных кадравых замен, да вышэйшых уключна, але з ўласнага кола. Падкоўдравая барацьба, але ж не сацыяльны выбух, не аксамітная рэвалюцыя.

Па-беларуску традыцыйна ціхая рэакцыя насельніцтва на дэвальвацыю, здаецца, ужо не ўводзіць уладную каманду ў зман. Крэдыт даверу на лязе дэвальвацыі — страчаны. Сёння ціха — заўтра нечаканы сацыяльны выбух. Уласны досвед з 1990-х уплывае мацней за ўрокі гісторыі.

Таму і не спыняецца ціск на моладзевых актывістаў: каго ў войска, каго з працы, каго з інстытута. Таму, ці не ўпершыню за апошні гады, А. Лукашэнка вярнуся да сваёй ролі пачатку 90-х — прапагандыста і агітатара, тлумачальніка сітуацыі. Праўда, не ў натоўпе і не перад натоўпам. Таму і абвешчаны штотыднёвыя выхады кіраўніцтва на заводы. Утрымаць, вярнуць крэдыт даверу. І заблакаваць на дальніх подступах дзве патэнцыйна самыя небяспечныя пляцоўкі каляровых рэвалюцый — заводы і студэнцкія аўдыторыі.

У прынцыпе, як сведчыць гістарычны досвед, аўтарытарная трансфармацыя сістэмы магчыма. Хутчэй за ўсё, гэты варыянт нас і чакае: сударгавая, расцягнутая на гады эвалюцыя палітычнай сістэмы. На жаль, не выключаны і другі варыянт: поўны адкат назад да класічнага, моцнага і жорсткага аўтарытарнага (таталітарнага) рэжыму. З поўным падаўленнем любой апазіцыі, любога супраціву. І абвалу бальшыні насельніцтва за мяжу сацыяльнага беднасці, замест сацыяльнага кантракта, а краіны — на задворкі цывілізацыі.

Адкат гэты таксама не на заўсёды, на час. Але жыццё чалавечае такое кароткае... І не дай нам Бог зноў пражыць такое. Куды хіснецца маятнік перамен, вызначыцца ўжо ў 2009 годзе. І залежыць гэта ад кожнага з нас.

**ПАВАЖАНЫЯ ПАДПІСЧЫКІ «НОВАГА ЧАСУ»!**

У мінулым годзе не па віне рэдакцыі не выйшлі тры нумары газеты.

Не хвалюйцеся: у кампенсацыю нашай запазычанасці адпаведную колькасць нумароў мы дашлем у новым годзе.

**Дзякуй за падтрымку!**
**Усім здароўя і поспехаў!**

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### САЛІГОРСК

**Кіраўніцтва РУП «Беларуськалій» рэкамендуе шахцёрам браць адпачынкі «ў сувязі з часовым прастоем прадпрыемства». Пра гэта паведаміў старшыня Незалежнага прафсаюза гарнякоў (НПГ) Іван Пярмінаў.**

Паводле яго слоў, на час адпачынку за работнікам захоўваюцца дзве трэці тарыфнай стаўкі, а працягласць адпачынку залежыць ад вытворчых абавязкаў. Цяпер з чатырох рудаўпраўленняў працуе толькі адно, адпаведна, незадзейнічаным шахцёрам цяжэй забяспечыць працу. Пры гэтым, зазначыў старшыня НПГ, «ніхто не прымушае шахцёраў ісці ў адпачынак насуперак іх жаданню», і скаргаў з боку работнікаў не назіраецца.

Як паведаміў І. Пярмінаў, у такой сітуацыі НПГ выступіў з ініцыятывай сабраць савет Беларускага незалежнага прафсаюза. Сход адбудзецца 15 студзеня ў Мінску. Падчас яго плануецца выпрацаваць агульную пазіцыю незалежнага прафсаюза, у тым ліку адносна сітуацыі на РУП «Беларуськалій».

У адміністрацыі прадпрыемства інфармацыю аб тым, што шахцёрам прапануюць браць адпачынкі, не каментуюць.

### ПЕТРЫКАЎ

**У Петрыкаўскім раёне рашэннем мясцовага райвыканкама за асобамі, якія абавязаны кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей, замацавалі кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і службаў.**

Як паведамілі ў камісіі па справах непаўналетніх Петрыкаўскага райвыканкама, гэтае рашэнне прынята для правядзення ў непасляховых сем'ях індывідуальнай выхаваўчай работы. Па вопыце работы Лоеўскага і Кармянскага раёнаў былі замацаваныя групы адказных — педагогаў, дэпутатаў, медыцынскіх работнікаў — за сем'ямі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Паводле інфармацыі камісіі па справах непаўналетніх, у раёне жывуць 75 так званых «абавязаных асоб», ці нядбайных бацькоў. Кіраўнікі прадпрыемстваў павінны садзейнічаць сацыялізацыі гэтых непасляховых сем'яў, кампенсаванню расходаў на ўтрыманне дзяцей.

### НАВАПОЛАЦК

**Грамадскасць Наваполацка занепакоена будаўніцтвам аўтазаправачнай газавай станцыі паблізу ракі Заходняя Дзвіна.**

Як паведаміў актывіст экалагічнага таварыства грамадскіх арганізацый «Зялёная сетка» ў Наваполацку Дзмітрый Воськін, 12 студзеня група экалагічных актывістаў горада накіравала запыты адносна правамоцнасці гэтага будаўніцтва начальніку Наваполацкай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзіміру Куксёнку і старшыні Наваполацкага гарвыканкама Наталлі Качанавай.

Паводле слоў Д. Воськіна, будаўніцтва АЗС пачалося з дазволу выканаўчага камітэта Наваполацка ў кастрычніку 2008 года. Цяпер на беразе Заходняй Дзвіны, паведаміў ён, яшчэ толькі «выкапана і агароджана яміна». Як зазначаюць эколагі, гэтая яміна знаходзіцца на адлегласці прыблізна 130 метраў ад ракі, хаця водаахоўная зона, у адпаведнасці з заканадаўствам, павінна складаць не менш чым 200 метраў.

Як лічаць прадстаўнікі «Зялёнай сеткі», такая блізкасць АЗС да Заходняй Дзвіны ўяўляе рэальную пагрозу хімічнага забруджвання вады ў рацэ. На іх думку, размяшчэнне АЗС таксама пагражае здароўю людзей: якраз насупраць знаходзіцца гарадскі пляж, а побач з ёю, на адлегласці прыкладна 15 метраў — прыпынак грамадскага транспарту. Паводле слоў Д. Воськіна, АЗС будуецца каля ажыўленага месца — прамысловага раёна з вялікай колькасцю крамаў.

### АСТРАВЕЦ

**Улады не задаволілі заяўкі ўдзельнікаў грамадзянскай ініцыятывы «Астравецкая АЭС — гэта злачынства» на правядзенне пікетаў у Смаргоні, Маладзечне і Вілейцы, паведаміў вілейскі дэмакратычны актывіст Аляксей Сюдак.**

Паводле яго слоў, у Маладзечне ўлады адмовілі ў сувязі з «непацверджаным грамадзянствам арганізатараў», у Смаргоні дзяржслужачыя матывавалі адмову тым, што «указ прэзідэнта аб будаўніцтве АЭС яшчэ не падпісаны», а ў Вілейцы райвыканкам спаслаўся на выбар заяўнікамі месца пікета, якое не ўваходзіць у пералік, вызначаны мясцовымі чыноўнікамі. Паводле слоў актывіста, правесці пікеты планавалася 10–17 студзеня.

Апрача таго, як зазначыў Сюдак, супраць актывістаў ініцыятыўнай групы «Астравецкая АЭС — гэта злачынства» арганізаваны правакацыі. Паводле яго слоў, у ноч з 8 на 9 студзеня ў Астравецкім і Смаргонскім раёнах невядомыя раскідалі ўлёткі ад імя грамадскіх актывістаў — жыхара вёскі Варняны Астравецкага раёна Івана Крука, жыхара Астраўца Мікалая Уласевіча, а таксама сябра сойму Партыі БНФ Алеся Дзергачова, які жыве ў Смаргоні. «Абедзве ўлёткі з'яўляюцца фальшыўкамі, мэта якіх — кампраметацыя ініцыятывы і яе актывістаў», — падкрэсліў Сюдак.

Паводле яго слоў, у сваёй заяве да пракурора Астравецкага раёна патрабуецца распачаць крымінальную справу супраць асоб, якія выдалі і распаўсюдзілі фальшывую інфармацыю ад імя грамадскіх актывістаў.

Як паведаміў Сюдак, прадстаўнікі грамадзянскай ініцыятывы запланавалі паўторную падачу заявак на пікетаванне. У выпадку адмовы грамадскія актывісты маюць намер звярнуцца ў суд і ў Савет Еўропы.

**Паводле БелаПАН**

АКЦЫЯ

# ІПЭШНЫ ПШЫК

**Вольга ХВОІН**

**Мітынг пратэсту прадпрымальнікаў на Кастрычніцкай плошчы Мінска сабраў аж траіх ІП і тры дзесяткі журналістаў. Лідэры прадпрымальніцкіх рухаў за «акцыяй» назіралі з розных бакоў праспекту.**

Напрыканцы мінулага года прадпрымальнікі правялі страйк і мітынг з патрабаваннем пакінуць у сіле пункт 3 прэзідэнцкага Указу № 285, дзеянне якога спынялася 1 студзеня 2009 года, аб ільготных умовах увозу тавараў з трэціх краін. 24 снежня Лукашэнка падпісаў Указ № 703, у адпаведнасці з якім умовы ўвозу тавараў паходжання з трэціх краін з тэрыторыі Расіі засталіся ранейшымі. Разам з тым падвысіўся казфіцыент стаўкі адзінага падатку з 1,5 да 2, павялічыліся базавыя стаўкі адзінага падатку — калі выручка ІП будзе перавышаць 20-кратную суму адзінага падатку, то з сумы такога перавышэння прыйдзецца даплачваць яшчэ 10 працэнтаў, да таго ж выплату ўсіх падаткаў і арэнднай платы прывязалі да курсу еўра.

12 студзеня прадпрымальнікі збіраліся правесці акцыю пратэсту, і не дзе-небудзь на водшыбе, а на Кастрычніцкай плошчы. Арганізатарам выступіў лідэр каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Аляксандр Макаеў. Аднак у анансаваны час на плошчу прыйшлі Ігар Леднік, прадпрымальнік з рынку Ждановічы і палітык Мікола Статкевіч. Развіцця падзей чакалі каля трыццаці журналістаў. Разам з імі за «акцыяй» з цікавасцю назіралі мінчане, якія коўзаліся на катку, супрацоўнікі міліцыі, начальнік упраўлення прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама Аляксандр Каліноўскі, а таксама лідэр грамадскага аб'яднання прадпрымальнікаў «Перспектыва» Анатоль Шумчанка. Апошні прарочыў мітынгу правал, а яго арганізатараў у адным СМІ назваў «лузэрамі». Відаць, каб не быць прылічаным да кагорты названай катэгорыі, ён размясціўся на процілеглым баку праспекта.

Праз паўгадзіны ад заяўленага пачатку на плошчы з'явіўся Аляксандр Макаеў. Нічога зразумелага наконт таго, чаму на анансаваную акцыю не прыйшлі людзі і чаму сам спазніўся, ён не змог сказаць.

— Вам не падаецца смешным: трыццаць журналістаў і тры прадпрымальнікі? — спыталі ў Макаева журналісты.

— Гэта зусім не смешна. Гэта паказчык сённяшняга грамадства. Можа, прадпрымальнікі вырашылі, што іх праблемы яшчэ не саспелі. Але мы лічым, што на плошчу трэба выходзіць не тады, калі будзе горача, а выходзіць на перамоўныя пляцоўкі. У нас ёсць свае прапановы ўраду, — адказаў Аляксандр.

Старшыня аргкамітэта па стварэнні грамадскага аб'яднання «За вольнае развіццё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў на мітынг 12 студзеня не прыйшоў, затое прапанаваў прадпрымальнікам правесці 25 сакавіка ў Дзень Волі «Марш пакрыўджаных і непачутых», бышцам бы пад такімі словамі могуць падпісацца многія беларусы. Але каляпалітычныя і нацыянальна свядомыя колы прапанову сустрэлі ў штыкі: маўляў, не трэба блытаць Божы дар з яешняй і рабіць сабе піяр на акцыі, якая мае зусім іншую каштоўнасць.

ЗАЯЎКА

# «МАЛАДЫ ФРОНТ» РЫХТУЕЦЦА ДА ДНЯ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

**Генадзь КЕСНЕР**




Фота Юрыя Дзядзінкіна

**У сераду 14 студзеня актывісты зарэгістраванага ў Чэхіі «Маладога фронта» Наста Палажанка, Таццяна Шапуцька і Кася Галіцкая падалі ў Мінскі гарвыканкам заяўку на правядзенне 14 лютага, на Дзень Святога Валянціна, святочнага шэсця і іншых урачыстых мерапрыемстваў.**

У аргкамітэт па святкаванні Дня Святога Валянціна ўвайшлі вядомыя ў Беларусі асобы — рок-музыка Піт Паўлаў, пісьменнік Уладзімір Арлоў, мастак Алесь Пушкін, кіраўнік Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

Як паведаміў лідэр «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч, арганізатары плануюць 14 лютага, апроч шэсця і перформансаў, правесці канферэнцыю на тэму, што такое любоў для пісьменнікаў, для мастакоў, іншых творчых людзей. На канферэнцыю мяркуецца запрасіць таксама і служыцеляў розных хрысціянскіх канфесій.

«Любоў — гэта шматгранная паняцце ў сучасным свеце, і нам як арганізацыі, заснаванай на хрысціянскіх каштоўнасцях, хочацца сцвярджаць менавіта такое духоўна-маральнае разуменне гэтага паняцця, — адзначыў Зміцер Дашкевіч. — Менавіта ў такім кантэксце мы імкнёмся праводзіць штогадовыя акцыі ў Дзень Святога Валянціна».

Што да самога святочнага шэсця, то арганізатары плануюць пачаць яго а 18-й гадзіне на сталічнай плошчы Якуба Коласа, прайсці па праспекце Незалежнасці праз Кастрычніцкую плошчу да плошчы Свабоды. Па словах Зміцера Дашкевіча, шэсце пачнецца імправізаваным перформансам і віктарынамі, а завершыцца невялікім канцэртам з удзелам беларускіх рок-музыкантаў і бардаў.

СУД

# КАНФІСКАЦЫЮ ПРЫЗНАЛІ ЗАКОННАЙ

**Вышэйшы гаспадарчы суд Беларусі 13 студзеня адмовіў па ўсіх пунктах іску царкве «Новае жыццё» Рэлігійнага аб'яднання абшчын хрысціян поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь да Мінскага гарвыканкама. Пра гэта паведаміў юрыст царквы Сяргей Луканін.**

Такім чынам, ВГС прызнаў законным рашэнне Мінгарвыканкама ад 17 жніўня 2005 года аб пазбаўленні абшчыны зямлі і храма па вул. Кавалёва, 72.

Паводле слоў С. Луканіна, царква «Новае жыццё» мае намер абскардзіць вынесенае рашэнне. «У нас няма на руках матывавальнай часткі. Суддзя яшчэ не абгрунтавала сваю пазіцыю. На працягу пяці дзён яна абяцала нам даслаць поштай матывавальную частку», — сказаў юрыст. Пасля гэтага на працягу 10 дзён вернікі могуць падаць скаргу.

«Думаю, што гэта рашэнне выносілася не ў кабінеце суддзі, — падкрэсліў С. Луканін. — Мяркуючы па тым, што суддзя на паўтара года спыняла разгляд справы з матывіроўкай аб неабходнасці правядзення кансультацый у кампетэнтных органаў, цяпер мы бачым вынікі гэтых кансультацый».

**Паводле БелаПАН**

ЗАКОНАПРАЕКТ

# МОЛАДЗЬ ЖАДАЕ ВЕДАЦЬ

Генадзь КЕСНЕР

**Недзяржаўныя моладзевыя структуры жадаюць узяць удзел у абмеркаванні законапраекта «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі», які паступіў у парламент. Пра гэта лідэры розных недзяржаўных моладзевых структур заявілі падчас «круглага стала», які адбыўся ў Мінску ў мінулыя выходныя.**



Арганізатарам мерапрыемства выступіла моладзевае крыло Аб'яднанай грамадзянскай партыі «Маладыя дэмакраты», а ўдзельнікамі былі прадстаўнікі арганізацый «Малады фронт», «Моладзь БНФ», ЛКСМБ, «Ініцыятыва», «Задзіночанне беларускіх студэнтаў», «Маладая Беларусь», Студэнцкая Рада, «Еўрапейскі моладзевы парламент», а таксама сябры Беларускага Хельсінскага камітэта.

Пра тое, што законапраект, які датычыць моладзі, ужо знаходзіцца ў Палацы прадстаўнікоў, па словах аднаго з лідэраў «Маладых дэмакратаў» Міхаіла Пашкевіча, стала вядома з кароткага паведамлення ў дзяржаўным інфармацыйным агенцтве БЕЛТА ў канцы мінулага года. Як высветлілася, фармальна змест дакумента быў даведзены толькі да ведама афіцыйных моладзевых структур — БРСМ, піянерскай і скаўцкай арганізацый. Недзяржаўныя моладзевыя структуры нават не ведалі пра існаванне такога законапраекта.

Як адзначыў Міхаіл Пашкевіч, за апошні тыдзень на ўсе яго спробы датэлефанавацца да Палаты прадстаўнікоў і атрымаць копію законапраекта ён чуў толькі адмоўныя адказы. Спроба знайсці тэкст законапраекта на афіцыйных парталах, куды адсылалі актывістаў, скончыліся безвынікова. «Самае цікавае, што нават метадыст апарату Палаты прадстаўнікоў кажа, што ў іх копія законапраекта толькі адна ў папяровым выглядзе, і нікому яны яе не пакажуць», — абураецца Міхаіл Пашкевіч.

Па словах даследчыцы медыяпраектаў, магістра грамадскай палітыкі Ірыны Віданавай, сёння варта прыцягнуць да абмеркавання законапраекта не толькі ўжо арганізаваныя моладзевыя структуры, але і проста маладых людзей. Калі думаць пра нейкае дзеянне ў сувязі з гэтым законам, то вельмі важна патрабаваць публічнасці, лічыць Ірына Віданава. «Пасыл, на мой погляд, можа быць вельмі простым: тое, чаго моладзь аднազначна вельмі не любіць, гэта калі ёй дакладна ўказваюць, як жыць і што рабіць. І вось тут мы маглі б сказаць маладзёнам: за цябе ізноў хтосьці вырашае, як табе жыць і што рабіць», — падкрэсліла эксперт.

Што да саміх дэмакратычных моладзевых структур, то, на думку аналітыка Ліберальнага клуба, сябра групы маладых экспертаў у супрацоўніцтве з Навукова-даследчым цэнтрам Мізеса Яўгена Прэйгермана, сёння ім таксама трэба мяняць тактыку: максімум актыўнасці ў тых сферах, у якіх яны маюць пэўную кампетэнцыю, менш радыкалізму ва ўсіх іх дзеяннях. На думку Яўгена Прэйгермана, радыкалізм выглядае жахліва для людзей, якія толькі пачынаюць асэнсоўваць тое, што здараецца ў грамадстве. «А калі мы станем менш радыкальнымі, ва ўмовах сённяшняга становішча, у нас ёсць магчымасць стаць публічнымі», — лічыць маладзён.

Як абгрунтаваў сваё меркаванне малады лібэрал, «хочуць тыя людзі, якія зараз знаходзяцца пры ўладзе, ці не, але ёсць пэўныя чыннікі, якія падштурхоўваюць іх да таго, каб слухаць нас і рабіць тое, што больш-менш не тычыцца такіх ужо выключна палітычных аспектаў, але ж для нас важна».

Прадстаўнік «Маладых дэмакратаў» Фёдар Масленнікаў нагадаў, што сёння ў дзяржаве рэалізуецца афіцыйная праграма «Моладзь Беларусі», якая, на думку актывіста, мае дэкларатыўны характар. Гэта праграма, як у ёй запісана, павінна падвышаць прэстыж атрымання адукацыі, там прадугледжаны праца з кадрамі па падвышэнню якасці адукацыі, выхаванне грамадзяніна-патрыёта, паляпшэнне ўмоваў працаўладкавання, удзел у сацыяльна-эканамічным жыцці краіны, дапамога маладым сем'ям і гэтак далей. «У прынцыпе, банальны набор слоў, які мы ўсе чулі і добра ведаем», — сказаў актывіст.

Фёдар Масленікаў упэўнены, што прынцып, калі дзяржава распрацоўвае законапраект, а потым працуе на ўзроўні суб'екта кіравання ў дачыненні да моладзі, не ёсць самым лепшым дыялогам. «Тут трэба стварыць яшчэ і адваротную сувязь, і было б пажадана, каб моладзь магла хаця б ускосна ўдзельнічаць у распрацоўцы такіх законапраектаў», — мяркуе актывіст «Маладых дэмакратаў».

Як адзначыў лідэр салігорскіх маладафронтаўцаў Іван Шыла, «другі шлях, які, на жаль, зараз вельмі папулярны — гэта ліц еўрапейскія слёзы і ўплываць канкрэтна на дыпламатаў, якія гэтыя пытанні ўздымаюць у кулуарных перамовах з рэжымам Лукашэнкі, і толькі такім чынам мы можам у парадак дня, які абмяркоўваецца з той жа намесніцай кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Наталляй Пяткевіч, унесці нашы прапановы».

Як бы тое ні было, прадстаўнікі моладзевых арганізацый вырашылі з дапамогаю прафесійных юрыстаў (напрыклад, з БХК) дабіцца атрымання тэксту законапраекта, абмеркаваць яго ў сваіх структурах і сабрацца праз два тыдні, каб вырашыць, што рабіць далей.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# МВФ НАРЭШЦЕ ВЫДЗЕЛІЎ КРЭДЫТ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Мы нарэшце атрымалі крэдыт. 12 студзеня Выканаўчы савет Міжнароднага валютнага фонду на сваім пасяджэнні ўхваліў праграму ўзгодненых з беларускім урадам мер эканамічнай палітыкі, якая прадугледжвае выдзяленне крэдыту ў памеры каля 2,5 мільярда долараў.**

Узгодненая з МВФ эканамічная праграма ўрада Беларусі падтрымліваецца з боку фонду дамоўленасцю аб крэдыце «стэнд-бай» на суму каля 2,5 мільярда долараў. Чакаецца, што Беларусь зможа атрымаць першы транш у памеры 800 мільёнаў долараў з названага крэдыту на працягу некалькіх дзён пасля ўхвалення праграмы Выканаўчым саветам МВФ.

Беларусь звярнулася ў МВФ па атрыманне крэдыту «ў мэтах павелічэння дзяржаўных золатавалютных рэзерваў і стварэння «падушкі бяспекі», неабходнай для стабільнай работы эканомікі ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу».

Папярэдняе рашэнне пра выдзяленне Беларусі крэдыту ў аб'ёме каля 2,5 мільярда долараў ЗША было прынята Міжнародным валютным фондам у апошні дзень 2008 года. Місія МВФ і ўрад Беларусі дасягнулі пагаднення аб эканамічнай праграме тэрмінам на 15 месяцаў. У заяве дырэктара-распарадчыка МВФ Дамініка Строс-Кана ад 31 снежня гаварылася, што «Беларусь апынулася ў складанай эканамічнай сітуацыі, і беларускія афіцыйныя органы цяпер робяць сур'ёзныя крокі па спыненні падзення рэзерваў, па аднаўленні эканамічнай стабільнасці і падрыхтоўцы глебы для аднаўлення эканамічнага росту».

Паводле інфармацыі МВФ, узгодненыя з беларускім бокам меры ўключаюць больш моцную грашова-крэдытную палітыку і сістэму палітыкі абменнага курсу, абмежаванне падаткова-бюджэтнай палітыкі шляхам скарачэння дзяржінвестыцый і мэтавага банкаўскага крэдытавання, а таксама строгае абмежаванне зарплаты ў дзяржаўным сектары.

Перамовы аб выдзяленні Беларусі крэдыту вяліся экспертамі МВФ з прадстаўнікамі беларускіх уладаў на працягу двух месяцаў — з канца кастрычніка па канец снежня.

У 1995 годзе МВФ спыніў выдзяленне крэдытаў Беларусі з-за неадпаведнасці эканамічнай палітыкі ўрада рэкамендацыям фонду. У пачатку 2004 года ўрад і Нацбанк Беларусі заявілі аб адсутнасці неабходнасці ў прыцягненні крэдытных рэсурсаў МВФ. З тых часоў супрацоўніцтва з фондам было сканцэнтравана на атрыманні тэхнічнай дапамогі і кансультацый.

Дрэнная навіна. Экіпаж беларускай каманды FlexGroup пацярпеў аварыю падчас праходжання маршруту чарговага этапу ралі-рэйда «Дакар–2009».

Як паведамляе прэс-служба пасольства Беларусі ў Аргенціне, 13 студзеня каманда FlexGroup (пілот — Сяргей Шкель, штурман — Аляксандр Тараненка) брала ўдзел у дзевятым этапе ралі-марафона «Дакар–2009», які праходзіў па тэрыторыі Чылі на кругавым адрэзку Кап'япа — Кап'япа.

Гэты маршрут пралягаў праз цяжкапраходныя пяскі пустыні Атакама. Падчас пераадолення адной з дзюн аўтамабіль беларускай каманды перакуліўся. Машына моцна пацярпела. Беларускі экіпаж скарыстаўся экстраннай кнопкай выкліку дапамогі. Экіпаж быў дастаўлены верталётам у лагер, дзе камандзе аказалі першую медыцынскую дапамогу.

Паводле інфармацыі пасольства, штурман А. Тараненка пасля агляду ўрачоў быў выпісаны з паходнага шпіталя. Пілот С. Шкель транспартаваны самалётам у адзін са шпіталяў горада Сант'яга з траўмай пазваночніка (канчатковы дыягназ урачы не ўдакладнілі).

Як паведаміў прэс-сакратар беларускай каманды Даніла Далматаў, на гэты момант С. Шкель знаходзіцца ў шпіталі «Мутуаль» у Сант'яга. Прэс-сакратару ўдалося звязацца з пілотам, які расказаў пра акалічнасці здарэння: «Дзесьці на 20-м кіламетры чацвёртая дзюна апынулася вельмі «вострай». Мы ўздымаліся ўверх, і праз імгненне аўтамабіль цераз «нос» пачаў перакульвацца ўніз. Мы ўпалі. Скарысталіся кнопкай. Нас забралі на верталёце ў медпункт у бівак да месца старту. З Сашам усё ў парадку, мне зрабілі рэнтген-здымак. Чакаю вынікаў. Што з аўтамабілем, не ведаю, механікі адправіліся да месца аварыі. Дабрацца на грузавіку туды немагчыма, мабыць, будуць спрабаваць яго завесці».

Паводле слоў Д. Далматава, сувязь была вельмі кепскай. «Па размове было зразумела, што Сяргей Шкель вельмі расстроены, але голас бадзёры. Цікавіўся вынікамі расійскіх экіпажаў, расказаў, што на першых трох дзюнах бачыў шмат перакуленых аўтамабіляў, у тым ліку і з расійскім сцягам», — паведаміў прэс-сакратар.

Паводле яго слоў, консульскім аддзелам пасольства Беларусі ў Аргенціне ўстаноўлены непасрэдны кантакт з урачамі. Пасольства будзе працягваць адсочваць сітуацыю з пілотам і аказваць камандзе неабходную дапамогу.

Тым часам арганізатары ралі-марафона «Дакар–2009» працягваюць адчуваць цяжкасці з маршрутам. Ужо некалькі спецучасткаў было скарочана, а сёння прынята рашэнне адмяніць 11-ы этап ралі, які быў запланаваны на 14 студзеня. Падчас яго ўдзельнікі павінны былі пераадолець 445 кіламетраў ад Кап'япа (Чылі) да Фіамбалы (Аргенціна). Прычынай адмены стаў кепскі прагноз надвор'я.

Ралі-рэйд «Дакар–2009» упершыню праходзіць па тэрыторыі Паўднёвай Амерыкі. Маршрут разбіты на 14 этапаў. Дзевяць з іх праходзяць на тэрыторыі Аргенціны, два — у памежных раёнах Аргенціны і Чылі, тры — у Чылі. Фінішуе гонка 17 студзеня ў Буэнас-Айрэсе. За два тыдні гоншчыкі пераадолеюць шлях даўжынёй 9 тысяч 578 кіламетраў. Беларуская каманда ўдзельнічала ў гэтай гонцы ўпершыню. Тэхнічную падтрымку беларускаму экіпажу аказвалі вадзіцель-механік Дзмітрый Запарошчанка, механікі Уладзімір Мотуз і Аляксандр Нікончык на грузавіку Mercedes Actros.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

# Йіржы Карас: «Я ВЕРУ, ШТО БЕЛАРУСЬ СТАІЦЬ НА ПАРОЗЕ ВЯЛІКІХ ПЕРАМЕН»

**Йіржы Карас узначаліў Пасольства Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі ў канцы ліпеня 2008 года. Да свайго новага прызначэння ён год быў консулам у нашай краіне. Са студзеня 2009 года Чэхія на працягу шасці месяцаў будзе выконваць функцыі старшыні Еўрасаюза. Пра стан і перспектывы адносін Беларусі з Чэхіяй і ЕС з Йіржы Карасам размаўляе шэф-рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль.**



***— Спадар Карас, за Вашымі плячамі багаты жыццёвы і палітычны досвед, у тым ліку, на жаль, і досвед драматычны — пераследаў і рэпрэсій Вас і Вашай сям'і камуністычным рэжымам Чэхаславакіі. У Вас няма адчування, што, калі Вы прыехалі ў Беларусь, Вы як бы здзейснілі вандроўку ў часе назад, сустрэліся з ценямі з мінулага? Ці не бачыце Вы на гэтым аўтарытарным фоне прымет, што прадказваюць дэмакратычныя змены ў Беларусі?***

— Мне досыць складана параўноўваць: да 1989 года я жыў у гэтым камуністычным рэжыме, а зараз я папросту назіраю. Уражанні тут не могуць быць такімі ж моцнымі. У сучаснага беларускага рэжыму ёсць асобныя элементы, што былі ў нас, але, безумоўна, праглядаюцца і элементы тых змен да лепшага, якіх у нас у 1989 годзе не было. Я б сказаў, што метады беларускага рэжыму мякчэйшыя, больш рафінаваныя.

***— Кніга Вашых дыялогаў з Карэлам Шварцам носіць парадаксальную назву «Выдатнае жыццё — сабаку пад хвост». Але Ваша жыццё складаецца як бы з дзвюх частак: да 1989 года і пасля.***

— Усё звязана. І ўсё гэта — маё жыццё. І ў першай яго частцы, да маіх 47 гадоў, я перажыў шмат шчаслівых момантаў. А з перажытага пасля змены палітычнай сітуацыі не ўсё магу аднесці да добрага. У маім жыцці да восені 1989 года мне, вядома ж, не падабалася, што людзей пераследавалі і трымалі ў турмах за іх перакананні. А пасля 1989 года мне не падабаецца, што людзі аддзяліліся адзін ад аднаго. Часам мне здаецца, што камуністы, якія абсалютызавалі матэрыяльнае, выйгралі ў нас пасля сваёй сакрушальнай паразы. Людзі атрымалі матэрыяльны дабрабыт, пра які раней і марыць не маглі, але ён стаў ці не асноўным сэнсам іх жыцця. Да 1989 года людзі рабілі большы акцэнт на духоўнае жыццё, нягледзячы на пераслед за свае перакананні. А цяпер, калі мы вольныя, пра гэтыя каштоўнасці забываем.

***— Якія перспектывы змены каштоўнасных арыентацый ад матэрыяльнага да духоўнага?***

— Я ўскладаю вялікія надзеі на ўсходнія краіны, на Беларусь. У кантэксце духоўнага аспекту, мне здаецца, у вас шмат чаму можна навучыцца. Я ведаю, што да 1990-х гадоў амаль усе цэрквы ў Беларусі былі зачыненыя, што царква практычна не магла вольна існаваць. А сёння я назіраю, як краіна перажывае духоўнае адраджэнне. Гэта мяне здзіўляе. І здзіўляе тым больш, што адбываецца гэта ў межах аўтарытарнага рэжыму, калі пра духоўныя каштоўнасці шмат гаворыцца, але якія сам рэжым не спавядае.

***— З пазіцый Вашага унікальнага палітычнага досведу — барацьбіта з таталітарным рэжымам і аднаго з архітэктараў «аксамітнай рэвалюцыі» ў Чэхіі — як Вам бачыцца сітуацыя ў нашай краіне ў кантэксце курсу ЕС на дыялог з Беларуссю?***

— Я думаю, што Чэхія вельмі добрае разумее Беларусь, бо мы мелі падобную палітычную гісторыю. Мы былі — не палітычна, а геаграфічна — усходнееўрапейскай краінай, з'яўляліся, як і Беларусь, часткай аднаго палітычнага блоку. Таму мы добра разумеем тое, што адбывалася да 1990 года, і тое, што адбываецца цяпер. Мы вельмі зацікаўленыя ў тым, каб Беларусь перажыла радыкальныя дэмакратычныя змены. Мы прапаноўваем беларускаму рэжыму дыялог. Але саступак мы рабіць не будзем. Мы жадаем сістэмных зменаў. Калі беларускі рэжым падасць руку насустрач працягнутай руцэ Еўрасаюза, думаю, гэта будзе спрыяць поспеху ўсёй Беларусі. Бліжэйшыя паўгода мы старшынюем у Еўрасаюзе і такім чынам будзем адыгрываць ролю пасярэдніка, камунікатара. І, мяркую, шмат на што такім чынам можам паўплываць.

***— Калі магчыма, удакладніце, якіх палітычных трансфармацый у Беларусі Вы чакаеце? І якія іх крытэры?***

— Гэта 12 патрабаванняў Еўрасаюза да Беларусі. Мы не жадаем, каб тут саджалі ў турмы па палітычных матывах. Хочам зменаў у выбарчым заканадаўстве і ў Крымінальным кодэксе ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі міжнародным супольнасцю дэмакратычнымі нормамі. Імкнёмся, каб СМІ у вашай краіне атрымалі ўсе законныя правы для сваёй свабоднай дзейнасці. Еўрапейскі саюз мае свае стандарты, і калі мы хочам весці дыялог, дык неабходна, каб Беларусь прытрымлівалася гэтых стандартаў. Мне здаецца, што гэта выгодна для абодвух бакоў. Мы можам прапанаваць эканамічнае супрацоўніцтва, а таксама супрацоўніцтва ў любых іншых сферах палітычнага і грамадскага жыцця.

***— Як Вы ацэньваеце ўзровень супрацоўніцтва Чэхіі і Беларусі на дзень сённяшні і ў перспектыве?***

— З 1997 года паміж нашымі краінамі практычна не было абмену візітамі на высокім узроўні. У канцы мінулага года першай значнай сустрэчай стаў візіт у Беларусь намесніка міністра замежных спраў спадара Пояра. Ваш намеснік міністра замежных спраў спадар Варанецкі назваў гэту сустрэчу гістарычнай. Калі мы будзем бачыць, што ў Беларусі адбываюцца пэўныя змены, павялічыцца і інтэнсіўнасць кантактаў. Эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі пашыраецца, але яго рэзервы невымерна большыя. Гаворка ідзе не толькі пра колькасць тавараў, мы здольныя прадставіць Беларусі тое, што завецца ноў-хаў.

***— Як адбіваецца на супрацоўніцтве нашых краін сусветны фінансавы крызіс?***

— Гэты крызіс уплывае на эканоміку ўсіх краін. Але ў выпадку пашырэння супрацоўніцтва паміж краінамі ЕС і РБ яго ўздзеянне на Беларусь стала б значна мякчэйшым. Трэба рэальна ацэньваць сітуацыю і добра падрыхтавацца да яе развіцця. Паглыбленне супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю было б карысна менавіта для Беларусі.

***— У чэшскім досведзе пераходу ад таталітарызму да дэмакратыі адной з галоўных умоў поспеху было дасягненне адзінства дэмакратычных сіл, заключэнне цвёрдых дамоўленасцяў, у тым ліку з часткай кампартыі, якая тады кіравала. Наколькі, на Ваш погляд, значны эфект адзінства для дэмакратычных сіл у сённяшняй Беларусі?***

— У Чэхаславакіі ў камуністаў не было іншага выйсця. Мы набліжаліся да эканамічнага дна, і камуністы гэта своечасова зразумелі. Дэмакратычныя ж сілы не прапусцілі моманту пэўнага паслаблення ўлады кампартыі, здолелі кансалідавацца і дамагчыся такіх зменаў, якія для камуністаў сталіся нечаканымі, і тыя ўжо былі няздольныя спыніць працэс. Але частка камуністаў здолела, абапіраючыся на старыя сувязі, выкарыстаць прыватызацыю ў сваіх інтарэсах. Аднак у цэлым усю гэтую сітуацыю я ацэньваю пазітыўна.

Што датычыць апазіцыі ў Беларусі, я думаю, што яна цяпер разрозненая і не здольная да кансалідацыі. Калі мова ідзе пра тую або іншую арганізацыю, сумна робіцца. Ёсць шэраг мужных, здольных, разумных, актыўных апазіцыянераў. Але праблемай з'яўляюцца асобныя групкі, якія не могуць дамовіцца пра агульныя мэты.

***— Магчыма, у тым ліку і праз слабасць беларускай апазіцыі палітыка дыялогу ўспрымаецца шмат кім — і ў нашай краіне, і ў краінах ЕС — далёка не адназначна. Якія перспектывы дэмакратычных змен у Беларусі з дапамогай палітыкі дыялогу?***

— Еўрасаюз — неабходнасць у Еўропе. Гэтае самае лепшае рашэнне з усіх дрэнных. Еўрапейцы павінны мець кантакты адзін з адным. Беларусы мусяць размаўляць з Еўрасаюзам, і наадварот. Вядома, гэта рызыка для ЕС, але той, хто нічога не робіць, — нічога не сапсуе. Я аптыміст, і я веру, што Беларусь стаіць на парозе вялікіх перамен і будзе дэмакратычнай краінай.

***— Чэхія — першая краіна, якая ў 2002 годзе адмовіла сп. Лукашэнку ў візе на ўезд у Чэхію на саміт NATO. А вось цяпер Чэхія можа стаць першай краінай, што запросіць яго на саміт Еўрасаюза, які адбудзецца ў Празе, як плануюць, у красавіку. Наколькі верагодна гэта запрашэнне і якімі крытэрамі яно абумоўлена?***

— На цяперашні момант сп. Лукашэнка можа падарожнічаць па ўсёй Еўропе дзе заўгодна. Калі б яму спатрэбілася шэнгенская віза, то, хутчэй за ўсё, ён бы яе атрымаў. Іншая справа, ці будзе ён запрошаны на саміт у Празе. Міністр замежных спраў Чэхіі, сп. Шварцэнберг казаў пра магчымасць такога запрашэння, але ці адбудзецца яно, будзе залежаць ад развіцця дыялогу паміж Беларуссю і ЕС. На дадзены момант ніякіх запрашэнняў яшчэ не дасылалася.

***— У чым Чэхія як старшыня ЕС бачыць асноўны сэнс і мэту новай праграмы Усходняга партнёрства ў адносінах да Беларусі?***

— Канчатковай мэтай, калі ўсё будзе развівацца ў правільным накірунку, стане палітычнае збліжэнне з Еўрапейскім саюзам і пашырэнне эканамічнага супрацоўніцтва.

***— У выпадку, калі ўмовы, якія высоўваюцца ЕС, не будуць выкананыя беларускім бокам на працягу шасці месяцаў, ці варта чакаць вяртання ЕС да санкцый, або дыялог будзе працягнуты?***

— Я аптыміст і веру, што мы не вернемся да пачатковай кропкі, што дыялог будзе працягвацца. У красавіку ЕС абмяркуе, якія змены адбыліся ў Беларусі, у якім месцы яна знаходзіцца на шляху да дэмакратызацыі, і прыме ўзгодненае рашэнне. Веру, што яно будзе пазітыўным.

***— На перыяд старшынства Чэхіі ў ЕС, акрамя сусветнага фінансавага крызісу, выпалі яшчэ дзве сур'ёзныя міжнародныя праблемы: вайна ў сектары Газа і «халодная газавая вайна» паміж Расіяй і Украінай. Якая пазіцыя Чэхіі як старшыні ЕС у вырашэнні гэтых праблем?***

— Тут, зноў жа, усе рашэнні будуць сумеснымі. Еўрапейскі саюз будзе паслядоўна рэагаваць на падзеі ў Газе. Галоўнае, у чым мы зацікаўленыя, — у найхутчэйшым аднаўленні тут міру. Мы таксама зацікаўленыя ва ўзнаўленні паставак газу ў Еўропу, у бесканфліктных стасунках паміж Расіяй і Украінай. Мы зацікаўленыя, каб Расія была добрым суседам для Беларусі.

***— Вядома, што Вы захапляецеся мастацтвам, што на ранейшых пасадах пытанні культуры ўваходзілі ў сферу Вашай палітычнай дзейнасці. Культурныя ж праграмы чэшскага пасольства ў нашай краіне атрымалі ўдзячнае прызнанне беларускай грамадскасці. Якія планы ў пасольства па развіцці культурнага супрацоўніцтва на гэты год?***

— Тут ёсць да чаго імкнуцца. Думаю, што сёлета наша супрацоўніцтва радыкальна актывізуецца. Мы пачалі працаваць з беларускай філармоніяй. Для мяне тут ёсць і асабістая матывацыя: я паходжу з тых жа мясцін, што і чэшскі кампазітар Сметана. У найбліжэйшых планах — арганныя канцэрты чэшскіх музыкаў. У лютым адбудзецца выстава чэшскай графікі. Фармаванне добрасуседскіх адносін — справа не толькі палітыкаў і дыпламатаў, але і дзеячаў культуры, студэнтаў і бізнесменаў.

***— Якое стаўленне ў Чэхіі да кансерватыўных каштоўнасцяў, да якіх Вы прыхільныя, на фоне вядомай статыстыкі, што сведчыць пра перавагу атэістычнай часткі насельніцтва ў Вашай краіне над вернікамі?***

— У нашым грамадстве сапраўды адбылося некаторае адхіленне ад рэлігійнасці. І не толькі ў Чэхіі. Але я веру, што Еўропа, у тым ліку Чэхія, вернецца да хрысціянскіх каранёў, хрысціянскіх каштоўнасцяў. Калі не вернецца, не будзе існаваць наогул...

***— Ужо паўтара гады Вы ў Беларусі. Як Вы сябе тут адчуваеце?***

— Як дома. Калядныя святы і Новы год я сустракаў тут. Разам дачкой і сынам, якія прыехалі да мяне. Дачка яшчэ засталася. Яна піша дыпломную працу, пачала вывучаць рускую мову і патроху беларускую. Сын з'ехаў, у яго іспыты. Шкадую, што пакуль у мяне атрымалася наведаць толькі Брэст і Белавежскую пушчу і не было часу павандраваць па ўсёй Беларусі. Але гэта задавальненне мяне чакае наперадзе.

МЕРКАВАННЕ

# ВАЙНА: ДЗВЕ ПРАЎДЫ

Аляксей ХАДЫКА

**У даўнім араба-ізраільскім супрацьстаянні ёсць дзве праўды, якія высоўваюць наперад абодва бакі, і гэтыя праўды надзвычай цяжка стасуюцца. Сведчаннем таму сямідзесяцігадовая гісторыя супрацьстаяння, у якой спробы весці мірныя перамовы рэгулярна перамяжаюцца ваеннымі канфліктамі.**






Амбасадар Палесціны ў Беларусі Мунтасер Абу Зейд

## Гістарычная даведка

Фактычнае выгнанне яўрэяў з сучасных земляў Ізраіля пачалося пасля падаўлення Рымам, правінцыяй якога Ізраіль быў на той момант, нацыянальнага паўстання Бар-Кохбы ў 135 г. н.э. З таго часу землі, пераназваныя рымлянамі Палесцінай, пераходзілі пад уладу Візантыі, Персіі, зноў Візантыі, арабскіх дынастый Амейядаў, Абасідаў і Фацімідаў (638–1099), крыжакоў (1099–1291), Мамелюкаў (1291–1516), Асманскай імперыі (1516–1917). У выніку арабскай асіміляцыі рэгіёна ў апошнія паўтара тысячагоддзі яўрэйскага насельніцтва ў ім амаль не было. У 1800 годзе ў Палесціне пражывала 5 тысяч яўрэяў з агульнага насельніцтва 300 тысяч (яўрэі канцэнтраваліся ў гарадах — Ерусаліме, Цфаце, Тверыі і Хеўроне). Першая вялікая хваля іміграцыі (першая алія) пачалася пасля 1881 года — часу пагромаў ва Усходняй Еўропе. Ідэалагічна яна была падтрымана кнігай галоўнага тэарэтыка палітычнага сіянізму Тэадора Герцля «Яўрэйская дзяржава» (1896). У ёй фармулявалася мэта стварэння нацыянальнай яўрэйскай дзяржавы, нацыянальнага дому на Зямлі Абяцанай. У часы пасля першай сусветнай вайны, калі Палесціна ад Турцыі перайшла пад мандат Вялікабрытаніі (1918–1947, у 1922 годзе зацверджаны Лігай Нацый), паводле плану сакратара замежных спраў Вялікабрытаніі Артура Бальфура («Дэкларацыі Бальфура»), распрацаванага яшчэ цягам вайны, брытанцы падтрымалі рэпатрыяцыю яўрэяў у Палесціну. Колькасць перасяленцаў за гэты час дасягнула 455 тысяч (звесткі Лігі Нацый). Актыўная іміграцыя скончылася ўрэшце пратэстамі арабаў з прычыны каланізацыі іх земляў, а затым Арабскім паўстаннем супраць брытанскага мандата ў 1936–1939 гадах. З паўстаннем сучасныя палесцінскія гісторыкі звязваюць фармаванне палесцінскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Урэшце, план Бальфура не выратаваў еўрапейскае яўрэйства ад нацысцкага знішчэння ў гады другой сусветнай вайны, але раскалоў Палесціну на два светы — арабскі і яўрэйскі.

27 снежня 2008 года ў сектары Газа пачалася наземная фаза вайсковай аперацыі «Літы свінец», названая ў прэс-рэлізе амбасады Ізраіля ў Беларусі «чарговым этапам па барацьбе супраць тэрору з сектара… і па знішчэнні апорных пунктаў тэрарыстаў, пускавых установак ракет і складаў зброі». На яе «Ізраіль рашыўся, калі ў яго не было іншага выйсця, нягледзячы на ўвесь яе цяжар». З другога боку, у размове 9 студзеня амбасадар Палесціны ў нашай краіне дуайен замежнага дыпламатычнага корпусу ў РБ спадар Мунтасер Абу Зейд паўтарыў фразу, якую беларуская медыя не наважыліся працытаваць пасля яго 30-хвіліннай прэс-канферэнцыі 31 снежня ў Нацыянальным прэс-цэнтры. «Мы захапляемся подзвігам беларускага народа ў часы другой сусветнай вайны, калі ён са зброяй у руках супраціўляўся гітлераўскім захопнікам. Змаганне народа Палесціны носіць той самы характар — яго землі акупаваныя».

Па стане на 13 студзеня ў выніку аперацыі «Літы свінец» загінула 930 палесцінцаў, сярод якіх 280 дзяцей, 98 жанчын і 97 старых, 4130 чалавек паранена (крыніца — *Euronews*). Ахвяры ізраільскага боку — 13 вайскоўцаў, некалькі дзесяткаў мірных жыхароў пацярпела і было паранена ў выніку абстрэлаў некіраванымі ракетамі «Касам» ізраільскага ўзбярэжжа з раёну сектару Газа. Дададзім, што падчас наземнай аперацыі міжнародныя назіральнікі адзначаюць амаль татальнае ігнараванне ізраільскім бокам Жэнеўскай канвенцыі па стаўленні да грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных, што прыводзіць да зрываў аказання гуманітарнай дапамогі. Гэта яшчэ больш напружвае сітуацыю ў адным з самых шчыльна населеных раёнаў свету, якім з'яўляецца сектар Газа. На магчымае выкарыстанне падчас аперацыі ізраільскай арміяй забароненай міжнароднымі канвенцыямі хімічнай зброі з белым фосфарам указвае міжнародная праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch. У адказ ізраільскі бок заяўляе, што белы фосфар выкарыстоўвала да іх армія ЗША падчас дзеянняў у Іраку ў 2003 годзе.

Нарэшце, на фоне шматтысячных дэманстрацый ва ўсім свеце — як праарабскіх, так і праізраільскіх, але з адным патрабаваннем: спыніць праліццё крыві — прадстаўнік ААН заяўляе: чалавецтва чарговы раз з расчараваннем назірае няздольнасць ААН выканаць сваю міратворчую місію.

Зараз рэдка прыгадваюць, што калі 29 лістапада 1947 года ААН прыняла дэкларацыю № 181 пра ўтварэнне на землях Палесціны дзвюх дзяржаў — яўрэйскай і палесцінскай — галоўныні ініцыятарамі іх стварэння выступілі СССР і ЗША. Пры гэтым пазіцыя ЗША была менш рашучай, і прэзідэнту Гары Трумэну давялося выказаць асабістую волю, каб пераадолець супраціў значнай часткі амерыканскага дзярждэпартамента. Пасля абвяшчэння Ізраіля 14 мая 1948 года незалежнай дзяржавай менавіта СССР першым у свеце прызнаў яго дэ-юрэ. Савецкая вайсковая дапамога сталася вырашальным фактарам, які дазволіў Ізраілю не толькі выстаяць у вайне 1948–1949 гадоў з Сірыяй, Ліванам, Трансіарданіяй, Егіптам і Іракам, што імгненна пачалі ваенныя дзеянні супраць яўрэйскай дзяржавы. Тэрыторыя Ізраіля нават павялічылася да 20,77 тысячы квадратных кіламетраў (на 6,7 тысячы квадратных кіламетраў) за кошт часткі з 11 тысяч квадратных кіламетраў, якія першапачаткова прызначаліся мандатам ААН 1947 года для стварэння арабскай Палесціны. Пасля Шасцідзённай вайны 1967 года, калі Ізраіль захапіў усе палесцінскія землі, у выніку ажыццяўлення плана «Мір у абмен на тэрыторыі» (рэзалюцыя ААН № 242) новыя межы, атрыманыя Ізраілем у 1948–1949 гадах, былі прызнаныя дэ-факта. Але ваеннае супрацьстаянне спарадзіла праблему арабскіх уцекачоў, якіх толькі ў 1948 годзе было 720 тысяч, а цягам наступных войнаў утваралася больш за 2 мільёны. Гэтыя людзі ўжо чацвёртае пакаленне жывуць у чаканні вяртання ў родныя дамы, якія яны пакінулі ў Ізраілі або на анексаваных палесцінскіх землях. І менавіта незлічоныя ўцекачы складаюць тую некантраляваную Палесцінскай нацыянальнай адміністрацыяй людскую стыхію (у Палесціны няма рэгулярнай арміі, толькі шматлікія паліцэйскія падраздзяленні), у якой нараджаецца антыізраільскі тэрарызм.

Вернемся да бягучых падзей. 9 студзеня 2009 Рада бяспекі ААН прыняла рэзалюцыю № 1860, за якую з 15 краін, што ўваходзяць у Раду, прагаласавала 14. ЗША ўстрымаліся, але не выкарысталі права вета. Рэзалюцыя заклікала да неадкладнага спынення агню з абодвух бакоў канфлікту. Рэзалюцыю, аднак, адмовіліся выконваць як Ізраіль, так і ХАМАС у Палесціне. Гэта вельмі істотны момант, паколькі, пасля перамогі ў сектары Газа на выбарах у студзені 2006 года руху ХАМАС, кіраўнік Палесцінскай нацыянальнай адміністрацыі Махмуд Абас, пераемнік Ясіра Арафата і лідэр ФАТХ (Руху за нацыянальнае вызваленне Палесціны, заснаванага Арафатам у 1956 годзе), рэальна кіруе толькі палесцінцамі Заходняга берагу Іардана. Дасягнутыя 27 лістапада 2007 года дамоўленасці па канчатковым рашэнні пытання аб незалежнасці Палесцінскай дзяржавы да канца 2008-га паміж ізраільскім прэм'ерам Эхудам Ольмертам і Махмудам Абасам завіслі ў паветры. Зараз ніхто не можа сказаць, як хутка можа быць скончаны гэты працэс, вытокам якога былі Мірныя дамоўленасці ў Осла паміж Шымонам Перасам і Махмудам Абасам, калі была заснаваная Палесцінская нацыянальная адміністрацыя для кіравання палесцінскімі тэрыторыямі, а Палесціна ў сваю чаргу прызнала дзяржаўнае існаванне Ізраіля.

Сёння дзейнічае па-ваеннаму простая логіка. ХАМАС, у адрозненне ад ФАТХ, не збіраецца падтрымліваць з Ізраілем мір. Ні намаганні ААН, ні мірны план Егіпта, які заклікае да спынення кровапраліцця, не знаходзяць падтрымкі сілаў, якія рэальна супрацьстаяць Ізраілю ў сектары Газа. У той жа час аперацыя «Літы свінец» фактычна ўзмацняе пазіцыі радыкальнага руху ў Палесціне. Калі ў выніку міжнароднага ціску аперацыя «Літы свінец» перапынілася часовым замірэннем (а іншых варыянтаў развіцця падзей не прадбачыцца), такі фінал будзе ўспрыняты палесцінцамі як перамога ХАМАС. Само прыняцце дэкларацыі ААН № 1860 разглядаецца ў свеце як дыпламатычная параза Ізраіля. «Літы свінец» нарадзіў ці спыніць ракетныя абстрэлы тэрыторыі Ізраіля. Ваенізаванае крыло ХАМАС і яго прадстаўнік Абу Абейда днямі заявілі, што ў іх застаецца дастатковая колькасць зброі, каб абстрэльваць Ізраіль «цягам доўгіх месяцаў». Затое ва ўсім рэгіёне ўзмацняюцца пазіцыі радыкальных сіл. «Хізбалла», саюзніца ХАМАС і вядучая сіла ў лівана-ізраільскай вайне 2006 года, мае ўсеса 128 у парламенце гэтай краіны. Летам 2009 года пройдуць выбары ў Іране, дзе з кожным днём працяг «Літога свінца» расце рэйтынг і шанцы пераабрацца на другі тэрмін прэзідэнта Махмуда Ахмадзінежада, вядомага сваёй антыізраільскай пазіцыяй. Сірыйскі прэзідэнт Башар Асад перапыніў з пачаткам вайны ў Газе апасродкаваныя перамовы з Ізраілем, якія вяліся з дапамогай Турцыі. ХАМАС, «Рух ісламскага супраціву», мае ўсе шансы адсунуць ФАТХ з кіруючых пазіцый на ўсеагульных выбарах у Палесціне праз год — ужо і на Заходнім беразе Іардана, насельніцтва якога са спачуваннем назірае за ваенным супрацьстаяннем ХАМАС ізраільскай агрэсіі.

Доўгія дзесяцігоддзі намаганні сусветнай супольнасці — у якіх браў удзел яшчэ СССР — не вядуць да агульнапрымальнага рашэння. Паспрабуем зірнуць на гэтую гісторыю з «беларускага боку».

Мой знаёмы, вядомы ў Беларусі выдавец, напалову яўрэй, з жахам падзяліўся сваёй асабістай гісторыяй. Скончыўшы яўрэйскую навучальную ўстанову ў Мінску, два гады таму ягоная дачка, дасягнуўшы паўналецця, выправілася ў Ізраіль. З жаданнем не толькі жыць, але і ваяваць за сваю новую Радзіму. «Я страціў дачку!» — сказаў бацька. Яна выправілася на зямлю, дзе яе продкі не жылі тысячагоддзямі, забыўшы, што нарадзілася і вырасла яна ў Беларусі».

Ужо падчас аперацыі «Літы свінец» напачатку 2009 года сусветныя агенцтвы перадалі страшны рэпартаж з сектара Газа. Рэгулярныя ізраільскія войскі сагналі ў жылы дом больш за сотню палесцінцаў. А праз дзень — гэта было на мінулым тыдні — яны разбамбілі дом. Загінула адразу каля 30 чалавек — выключна жанчыны і дзеці.

Гэта адна праўда. Амаль поўная. Ёсць праўда ізраільскага боку: барацьба з тэрарызмам. Сапраўды, хоць Палесціна не мае рэгулярнай арміі і ўжо колькі дзесяцігоддзяў не можа ўладкавацца як упарадкаваная дзяржава, з яе зямлі — з рознай насычанасцю — вядзецца абстрэл прылеглых да сектара Газа тэрыторый некіраванымі ракетамі. А некіраваныя ракеты таксама не выбіраюць сабе ахвяр, для іх «няма ні эліна, ні іудзея».

На шчасце, Ізраіль — не выключна монанацыянальная дзяржава. Яўрэі складаюць у ёй 75,5 працэнта насельніцтва, а арабы, у тым ліку мусульмане — 20,2 працэнта. У краіне застаецца рэсурс талерантнасці. На шчасце, у Палесціне палітычны спектр складаецца не толькі з радыкальных сілаў. Вайна ж узмацняе радыкальнае крыло ХАМАС. Але ўзмацненне радыкалаў па абодва бакі абяцае толькі новае супрацьстаянне і новыя ахвяры. Застаецца спадзявацца, што словы амбасадара Палесціны ў РБ Мунтасера Абу Зейда — «галоўнае — спыненне ваеннай аперацыі і агню ў сектары Газа і спыненне акупацыі палесцінскіх земляў», — будуць пачутыя. Як у Ізраілі, так і ў радыкальных колах ХАМАС, бо асноўным прынцыпам перамоўнага працэсу, распачатага паміж Ізраілем і Палесцінай у 1993 г. у Осла і працягнутага дамоўленасцямі 2007 года паміж Эхудам Ольмертам і Махмудам Абасам, быў «мір Ізраілю — дзяржаўнае ўладкаванне Палесціне».

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# Людміла Гразнова: УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ТАГО, ДА ЧЫІХ ГРУДЗЕЙ ПРЫСМОКЧАЦЦА ЎЛАДА

Вольга ХВОІН

**Вынікі мінулага года ў сферы правоў чалавека праваабаронцы ацанілі даволі пазітыўна. «Актывісты палітычных і грамадскіх няўрадавых арганізацый загаварылі, што ў другой палове 2008 года «стала лягчэй дыхаць», — адзначыла старшыня «Праваабарончага альянсу» Людміла Гразнова падчас прэзентацыі «Хронікі парушэння правоў чалавека ў Беларусі ў 2008 годзе».**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Разам з тым праваабаронцы адзначылі, што ў параўнанні з 2007 годам летась пагоршылася сітуацыя са звальненнямі з працы і выключэннямі з навучальных устаноў па палітычных матывах грамадскіх актывістаў, былі зафіксаваныя факты ціску на журналістаў, якія працуюць на недзяржаўныя СМІ, а таксама масавыя допыты па ўсёй краіне па справе аб выбуху 3 ліпеня ў Мінску.

Паводле «Хронікі парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2008 годзе», было заведзена 22 крымінальных справы ў дачыненні да актывістаў апазіцыі (у 2004 годзе іх было 15). У асноўным, крымінальныя справы заводзіліся супраць моладзевых актывістаў. Былі асуджаны на тры гады зняволення журналіст закрытай газеты «Згода» Аляксандр Сдвіжкоў за перадрук карыкатуры на прарока Мухамеда, паўтара гады калоніі атрымаў актывіст і лідэр «Ініцыятывы» Андрэй Кім, а лідэр прадпрымальніцкага руху Сяргея Парсюкевіч — 2,5. У няволі знаходзіўся былы прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін. Тое, што ўсе палітвязні ў другой палове года былі вызваленыя, праваабаронцы лічаць вельмі станоўчым крокам.

Праваабаронцы звяртаюць увагу на шэраг звальненняў па палітычных матывах, выключэнне з універсітэтаў, арышты, збіцці актывістаў апазіцыі. За год працу страцілі 14 чалавек — усе актывісты розных партый і арганізацый. У асноўным гэта былі асобы з рэгіёнаў. З навучальных устаноў выключылі 12 актывістаў моладзевых арганізацый. Упершыню са школы выключылі школьніка — актывіста «Маладога Фронту» Івана Шылу з Салігорска. На днях стала вядома, што яго мусяць бліжэйшым часам прызваць у войска, такім чынам у юнака будзе магчымасць здаць іспыты за курс сярэдняй школы толькі праз паўтара гады.

Масавыя вобшукі ў рэдакцыях радыё «Рацыі», «Еўрапейскага радыё для Беларусі», тэлеканала «Белсат», а таксама ў кватэрах журналістаў праваабаронцы называюць самым цяжкім для журналістаў эпізодам мінулага года.

Яшчэ адна адметнасць — пакаранні нязгодных з дзеяннямі ўлады штрафамі. За год быў аштрафаваны 81 чалавек (73 — у 2007-м). Памер штрафаў прыкметна ўзрос у параўнанні з мінулымі гадамі. Крыху зменшылася колькасць арыштаў: «суткі» адбылі 107 актывістаў (пазалетась — 116).

Існуюць праблемы і ў галіне права на справядлівы суд. Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, дзе не ўведзены мараторый на смяротнае пакаранне. У 2006 годзе было вынесена 9 «расстрэльных» вердыктаў, у 2007 — 4. На пачатак 2008 года было вядома пра траіх расстраляных. Актуальным застаецца пытанне, што стала з палітыкамі, якія прапалі без вестак, — Юрыем Захаранкам, Віктарам Ганчаром, прадпрымальнікам Анатолем Красоўскім, журналістам Дзмітрыем Завадскім.

Людміла Гразнова падкрэслівае, што любыя станоўчыя крокі дзяржавы ў галіне правоў чалавека варта падтрымліваць. «Як толькі ўзгадваецца дыктатура, «крывавы рэжым», Еўропа адразу палохаецца, адгароджваецца і гаворыць: «Мы з вамі не маем ніякіх спраў». І Беларусь застаецца сам-насам з іншай суседкай. А ёй гэта толькі і трэба. І тым, хто імкнецца загнаць Беларусь у ізаляцыю, балота, — гаворыць праваабаронца. — Таму рэальная ацэнка сітуацыі і разуменне таго, што трэба быць бліжэй да Еўропы — гэта найбольш прадуктыўны і правільны ў палітычных адносінах падыход. Калі нехта ўвесь час гаворыць толькі пра «крывавы рэжым», значыць або нічога не разумее, або працуе на Маскву». Ці будзе паляпшацца сітуацыя з правамі чалавека сёлета, залежыць ад знешняй палітыкі дзяржавы, упэўненая Людміла Гразнова: «Усё будзе залежаць ад таго, да чыіх грудзей збіраецца прысмактацца ўлада. У любым выпадку трэба разумець, што мы жывём у таталітарнай дзяржаве, і калі адбываюцца нейкія змены да лепшага, мы павінны іх адзначаць».

## КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ЖЫЛЛЁ, ДАПАМОГА, ПРАЦА



**У гэтым годзе мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронцы Алега Волчака на пытанні людзей, якія звярнуліся ў грамадскую прыёмную.**

- *Майго сына выселілі з інтэрната. У яго немаўля. Ці маюць права яго выселіць з інтэрната прымусова ўзімку?*
  *Нікалайчанка М. М., Мінск*

У зімовы перыяд высяленне з жылых памяшканняў з малалетнімі дзецьмі недапушчальнае. Вашаму сыну неабходна напісаць заяву судоваму выканаўцу пра прыпыненне выканання рашэння суда і прыкласці копію пасведчання пра нараджэнне дзіцяці.

- *Якім чынам я магу звярнуцца ў міжнародныя судовыя інстанцыі?*
  *Макушэўская Э. М., Пінск*

На жаль, цяпер беларусы не могуць звяртацца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека — Беларусь не з'яўляецца сябрам міжнароднай арганізацыі Рады Еўропы. Аднак вы маеце магчымасць звярнуцца ў Камісію па правах чалавека пры ААН. Для гэтага неабходна прайсці суд касацыйнай інстанцыі, напісаць адпаведную заяву і прыкласці дакументы. Заява падаецца ў офіс прадстаўніцтва ААН у Мінску па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Кірава, 17 (6 паверх). Або вы можаце непасрэдна накіраваць яе па адрасе: Камітэт па правах чалавека Арганізацыі аб'яднаных нацый, Швейцарыя, г. Жэнева 10, авеню Міра, 8–14.

- *Я інвалід 2-й групы. У камандзіроўцы атрымаў электратраўму. Прадпрыемства не выплачвае мне дапамогу за згубленую працаздольнасць. Што мне рабіць?*
  *Бортнікаў З.І., Брэст*

Напішыце іскавую заяву ў суд па месцы знаходжання прадпрыемства. Да іску прыкладзіце дакументы, якія пацвярджаюць наяўнасць прычыненай здароўю шкоды, інваліднасці (гэта можа быць выпіска з медыцынскай карты, копія пасведчання аб інваліднасці, заключэнне МРЭК), а таксама копію акту формы Н–1. Суд спагоніць з прадпрыемства суму на пакрыццё прычыненай шкоды.

- *Мяне пазбавілі дзеяздольнасці, але я жыву самастойна, сам атрымліваю пенсію, у мяне на руках пашпарт, сам вяду хатнюю гаспадарку. Як мне дабіцца адмены рашэння суда?*
  *Аляксандраў А.У., Гомель*

Вы можаце звярнуцца ў суд з іскам пра прызнанне дзеяздольным. У іску пакажыце, што жывеце самастойна, самі атрымліваеце пенсію, у вас на руках пашпарт, што вы самі вядзеце хатнюю гаспадарку. Запрасіце ў суд сведак, якія пацвердзяць дадзеныя факты. На падставе гэтага, кіруючыся арт. 29 Грамадзянскага кодэкса, суд прызнае вас дзеяздольным.

- *Мая нявестка разводзіцца з сынам. Ці можна ім падзяліць маёмасць пры разводзе?*
  *Якавенка М.З., Магілёў*

Ваш сын можа падаць іскавую заяву пра падзел маёмасці. Маёмасць, якая мусіць дзяліцца, павінна быць набытая ў шлюбе. Маёмасць, набытае да шлюбу або падораная падчас шлюбу, падзелу не падлягае. У іскавай заяве пералічыце ўсё, што жадаеце падзяліць, укажыце прыкладны кошт гэтых рэчаў. За падзел маёмасці выплачваецца дзяржпошліна ў памеры 5 працэнтаў ад сумы сваёй долі ў агульнай маёмасці.

- *Мая сяброўка развялася з мужам. У іх аднапакаёвая непрыватызаваная кватэра. Прыватызаваць яе муж катэгарычна адмаўляецца. Сяброўка вымушана спаць або на лоджыі (да халадоў), або на кухні. Былы муж маральна і фізічна працягвае здзекавацца з яе. Некалькі разоў яна выклікала міліцыю. Здымала пабоі. Перыядычна міліцыя праводзіць гутаркі з былым мужам, аднак пагрозы з яго боку працягваюцца, асабліва калі ён напіваецца. Пасля апошняга п'янага скандалу, калі ёй пагражаў сякерай і нажом, былога мужа забралі ў міліцыю (на адну ноч). З ім правялі чарговую гутарку і адпусцілі дадому. Вярнуўшыся з міліцыі, ён з парога паабяцаў, што ўсё роўна заб'е яе. Сяброўка працуе завучам у школе, таму ў яе няма ніякай фінансавай магчымасці сысці на кватэру або ўвайсці ў кааператыў, а таксама ўзяць крэдыт. Пражыванне па некалькі дзён у сябровак — не варыянт, ёй ужо хутка 51 год. Падкажыце хоць нейкае выйсце з гэтай сітуацыі.*
  *Гагарына А. Л., Мінск*

Мужа вашай сяброўкі можна выселіць з кватэры па арт. 39 Жыллёвага кодэкса. Для гэтага неабходна напісаць іскавую заяву пра высяленне былога мужа ў суд па месцы жыхарства вашай сяброўкі.

У заяве трэба паказаць, што былы муж збівае жанчыну, п'е, псуе маёмасць, мае прывады ў міліцыю і неаднаразова прыцягваўся за побытавыя скандалы да адміністрацыйнай адказнасці. У сувязі з гэтым сумеснае пражыванне з ім немагчымае і ён падлягае высяленню без прадстаўлення іншага жылога памяшкання. Запатрабуйце ў суд матэрыялы адміністрацыйных спраў па побытавых скандалах, выклічце ў суд сведак, якія пацвердзяць усе факты. І былога мужа выселяць.

Ёсць і іншы варыянт. Напісаць заяву пракурору раёна аб прыцягненні былога мужа да крымінальнай адказнасці за хуліганства па арт. 339 Крымінальнага кодэкса. Пасля таго, як былы муж будзе адбываць пакаранне, яго спакойна можна будзе выселіць і пасля гэтага прыватызаваць кватэру.

- *Ці магу я ўладкавацца на працу ў Расіі? Якія дакументы для гэтага патрэбныя?*
  *Сяргун М. І., Орша*

Паводле падпісанай нашымі краінамі дамовы аб стварэнні саюзнай дзяржавы, працаўладкаванне грамадзян Беларусі ў РФ свабоднае. Неабходныя дакументы пералічаны ў Працоўным кодэксе РФ, а менавіта:

1) пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу; дакументы воінскага ўліку (для ваеннаабавязаных і асоб, што падлягаюць прызыву на вайсковую службу);

2) працоўную кніжку (за выключэннем тых, хто ўпершыню паступае на працу і сумяшчальнікаў);

3) дыплом або іншы дакумент аб адукацыі і прафесійнай падрыхтоўцы, які пацвярджае наяўнасць права на выкананне дадзенай працы;

4) накіраванне на працу ў кошт броні для асобных катэгорый працаўнікоў у адпаведнасці з заканадаўствам;

5) заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі (МРЭК) пра стан здароўя (для інвалідаў);

6) дэкларацыя пра прыбыткі і маёмасць, страхавое пасведчанне, медыцынскае заключэнне пра стан здароўі і іншыя дакументы, што пацвярджаюць пэўныя акалічнасці, якія маюць дачыненне да працы, калі іх прад'яўленне прадугледжана заканадаўчымі актамі.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 19 СТУДЗЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**05.25** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.10** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 15.25** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Хрышчэння Гасподня.
**09.25** Nota Bene.
**09.50** Здароўе.
**10.20** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.15** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**12.10** Лірычная камедыя «Па сямейных акалічнасцях» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.30** Цыкл «У інтэрасах нацыянальнай бяспекі». Хранікальна-дакументальны фільм «МНС. Тэрыторыя бяспекі».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «ІНТУІЦЫЯ».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.40** «Арэна». Праграма аб спорце.
**20.00** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Фінал Нацыянальнага тэлевізійнага музычнага праекту «Еўрафэст». Прамая трансляцыя.
**23.35** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**00.30** Дзень спорту.
**00.40** Усе стыхіі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Фільм «Дзіцячы свет».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Дзіцячы свет». Працяг.
**11.40** «Элька». Анімацыйны фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**23.55** «Прафесійны бокс».
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Наша справа».
**14.30** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Фантастычныя гісторыі».
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Вы не пакінеце мяне». Расія.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.00** «Закон і крымінал».
**00.05** «Сталічны футбол».
**00.35** «Гучная справа».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Тэлебарометр.
**08.35** Усё аб бяспецы.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**09.55** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.45** Сямейная драма «Танцы падчас Луназы» (Ірландыя- Вялікабрытанія-ЗША).
**12.20** «Гаспадар».
**12.50** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.40** Бухта капітанаў.
**14.20** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** «Таемны густ». Кулінарная праграма.
**15.45** «Шунін і бландынкі». Аўтамабільная праграма.
**16.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**19.50** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 1-я серыя.
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.20** Хакей. Формула гульні.

---

РОССИЯ

**07.00** «Руская народная група «Боні М».
**07.45** Фільм «Выкраданне чарадзея». 1989 г.
**09.30** Пакой смеху.
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Фільм «Не бойся, я з табой!». 1981 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Артыст забытага жанру. Уладзімір Шубарын». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кепка ў клетку». Дак. фільм.
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлесерыял «І падае снег...», 2007 г. Заключная серыя.
**21.30** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**22.30** «Кулагін і партнёры».
**23.00** «Весткі+».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Нясмешнае жыццё смешнага чалавека. Готліб Ронінсан». Дак. фільм.
**00.20** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў».
**15.10** «Прафесія - рэпарцёр».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.20** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**22.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.05** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

---

EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**15.00** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**15.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 1-ы.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Снукер. Мастэрс. Лондан. Фінал.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб (Эйндховен, Нідэрланды).
**00.00** Футбол. Еўрагалы.
**00.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.00** Снукер. Мастэрс у Вялікабрытаніі (Лондан). Фінал.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.

## 20 СТУДЗЕНЯ, АЎТОРАК

---

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.10, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.55** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Клецк» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 00.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.50** Дэтэктыў «Начны дазор» (ЗША).
**00.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Чакай мяне».
**09.50** Ералаш.
**10.15** «Шчаслівы Эльф». Анімацыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм. 22-я серыя.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына». 11-я серыя.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Застацца ў жывых». Шматсер фільм.
**00.00** «Зваротны адлік».
**00.30** Нашы навіны.
**00.45** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Вы не пакінеце мяне». Расія, 2006г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя прыгоды дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Опер Гак». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Рэактыўны бокс».
**01.00** «Надзвычайныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**11.50** Хакей. Формула гульні.
**12.20** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 1-я серыя.
**13.40** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.30** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Бітва экстрасэнсаў.
**16.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**19.45** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 2-я серыя.
**22.20** Спорт-кадр.
**22.50** Лірычная камедыя «Тупы тоўсты заяц» (Расія).

---

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «І падае снег...», 2007 г. Заключная серыя.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**12.15** Вострасюжэтны фільм «Камісар Мантале» (Францыя). 2001 г. 1-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пабітыя мары акторкі Нікішчыхіной». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі».
**21.35** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**22.30** «Кулагін і партнёры».
**23.00** «Весткі+».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Адгадаць лёс. Яўген Петрасян». Дакументальны фільм.
**00.20** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Следства вялі...».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.15** Вострасюжэтны серыял «Двое з куфара».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**15.15** «Прафесія - рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Масква. Цэнтральная акруга-2».
**18.10** «Злачынства ў стылі мадэрн».
**18.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.20** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**22.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.05** Містычны серыял «Медыум».

---

EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**15.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Абавязковая праграма. Прамая трансляцыя.
**16.45** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 2-і.
**18.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Вось дык так!!!
**19.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Пары. Кароткая праграма. Прамая трансляцыя.
**22.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі IBF/WBA у Канадзе.
**00.00** Вось дык так!!!
**00.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар-2009. Агляд.
**01.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 2-і.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 21 СТУДЗЕНЯ, СЕРАДА

---

**05.15** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.15, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.20** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.25** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50, 00.45** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.50** Баявік «Параграф 78» (Расія).
**00.35** Дзень спорту.
**01.30** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Застаца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.00** Тэорыя неверагоднасці. «Жыццё без сэксу».
**00.40** Нашы навіны.
**00.55** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Опер Гак». Серыял.
**09.50** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.50** «Опер Гак». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Зоркі спорту».
**00.55** «Дэтэктыўныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Свая музыка.
**11.20** Пасоўванне +.
**11.50** Спорт-кадр.
**12.20** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 2-я серыя.
**13.40** Меладраматычны серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.30** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**19.50** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 3-я серыя.
**22.15** «Іншыя». «Багна чорнага запалу».
**22.40** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.05** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**12.15** Вострасюжэтны фільм «Камісар Мантале» (Францыя). 2001 г. 2-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «2012. Ці спраўдзяцца вяшчунствы майя?». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі».
**21.35** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**22.30** «Кулагін і партнёры».
**23.00** «Весткі+».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Прэм'ера. «Мікалай Другі. Сарваны трыўмф». Дакументальны фільм.
**00.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**10.00** Сёння.
**10.25** «Пакой адпачынку».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.15** Вострасюжэтны серыял «Двое з куфара».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**15.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Масква. Цэнтральная акруга-2».
**18.10** «Злачынствы ў стылі мадэрн».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.20** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**22.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.05** Містычны серыял «Медыум».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**15.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Мужчыны. Кароткая праграма. Прамая трансляцыя.
**17.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Монтэ-Карла). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**18.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Пары. Кароткая праграма.
**18.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Пары. Адвольная праграма. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Пары. Адвольная праграма. Прамая трансляцыя.
**22.30** Абранае па серадах.
**22.35** Конны спорт. Кубак свету. Канкур (Лейпцыг, Германія).
**23.35** Навіны коннага спорту.
**23.40** Гольф. Турнір PGA. Соні Оупен (Ганалулу, ЗША).
**00.40** Гольф-клуб. Навіны гольфа.
**00.45** Яхт-клуб. Навіны ветразнага спорту.
**00.55** Абранае па серадах.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Монтэ-Карла). Дзень 1-ы.
**01.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Дзень 3-і.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.

## 22 СТУДЗЕНЯ, ЧАЦВЕР

---

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.15, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.20** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** «Уласнай персонай».
**14.30** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне». 1-я частка.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 00.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.50** Баявік «Параграф 78: Фільм 2-і» (Расія).
**00.45** Дзень спорту.
**01.40** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Застаца ў жывых». Шматсерыйны фільм.
**00.00** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.30** Нашы навіны.
**00.45** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Опер Гак». Серыял.
**09.50** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Малая Радзіма». Іўе.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Опер Гак». Серыял. Закл. серыя.
**22.00** «Асабісты інтэрас».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Гарачы лёд».
**01.00** «Сакрэтныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** «Невытлумачальна, але факт».
**11.35** «Медычныя таямніцы «.
**12.05** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах». (СССР). 3-я серыя.
**13.15** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.05** Пазакласная гадзіна.
**14.20** Танцы без правіл.
**15.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.50** Мультфільм.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**19.50** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**21.00** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). 4-я серыя.
**22.25** Час футболу.
**22.50** «Проста праграма».
**23.30** Хакей. НХЛ. Матч тыдня. Атланта-Філадэльфія.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.05** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі», 2007 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**12.15** Вострасюжэтны фільм «Камісар Мантале» (Францыя). 2001 г. 3-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Таямніца егіпецкіх пірамід». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Формула ўлады».
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі», 2007 г.
**21.35** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**22.30** «Кулагін і партнёры».
**23.00** «Весткі+».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Прэм'ера. «М.Манро, Э.Куін і іншыя. Фабрыка Зорак М.Чэхава». Дакументальны фільм.
**00.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Дачны адказ».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Цуд-людзі».
**10.50** «Дужанне за ўласнасць».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Двое з куфара».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Масква. Цэнтральная акруга-2».
**18.10** «Злачынствы ў стылі мадэрн».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Павуцінне-2».
**21.20** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**22.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.05** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**16.45** Ралі. Ралійная серыя IRC (Монтэ-Карла). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**17.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Арыгінальная праграма.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Жанчыны. Спрынт.
**20.15** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Мужчыны. Адвольная праграма. Прамая трансляцыя.
**23.00** Бокс. Міжнародны паядынак у Кітаі.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Монтэ-Карла). Дзень 2-і.
**01.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 4-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.

## 25 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.45** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**07.10** Меладрама «Вандраванне будзе прыемным» (СССР).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00** Навіны.
**09.05, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.05** Культурныя людзі.
**10.40** Усе стыхіі.
**11.15** У свеце матораў.
**11.45** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.00** Навіны.
**12.20** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**13.05** Эксцэнтрычная камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (СССР - Італія).
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Nota Bene.
**16.05** КВЗ. Фэст смешнага відэа «Квенцін-2008».
**17.50** Суперлато.
**18.45** Камедыйная меладрама «Рэцэпт вядзьмаркі» (Расія).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Гістарычная драма «Здані Гойі» (ЗША - Іспанія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** Разумніцы і разумнікі.
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.10** «Дарослыя казкі аб жывёлах».
**13.40** «Зваротны адлік».
**14.10** Фільм «Сказ пра то, як цар Пётр арапа ажаніў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Канцэрт М.Задорнава.
**17.10** Прэмія «Тэфі - 2008». Уладзімір Высоцкі і Марына Владзі. Апошні пацалунак».
**18.10** Да Дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. «Свая каляіна».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.15** Прэм'ера. Камедыя «Дзяўчына майго сябра». ЗША, 2008.
**00.00** «Камедзі Клаб».

**07.00** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Камедыя «Падвойная асечка». ЗША, 2001 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.45** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Добры дзень, доктар!».
**13.00** Фільм «Небяспечныя гастролі». СССР, 1969г.
**14.35** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «У апошні раз». ЗША, 2006 г.
**22.20** «Спартовы тыдзень».
**23.00** «Вялікая гісторыя»: «Сусвет. Таямніцы сонечнай бездані».
**00.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.40** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Мультфільм.
**10.20** Прыгодніцкі серыял «Капітан Нема» (СССР). 3-я серыя, заключная.
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.00** Пасоўванне+.
**12.20** Слова пісьменніка.
**12.50** Мультфільм.
**13.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.05** Спорт, спорт, спорт...
**14.35** Спявай, душа.ву.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.05** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**18.35** Гістарычная меладрама «Сказ пра то, як цар Пётр арапа ажаніў» (СССР).
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** «Правы чалавека».
**20.55** Рамантычная камедыя «Студэнтка» (Францыя).
**22.45** Свая музыка.
**23.10** Пасоўванне +.
**23.40** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. «Шыннік» (Бабруйск)-»Юнасць» (Мінск).

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Экранізацыя рамана «Расія маладая». 1982 г. 6-я серыя.
**08.25** Мультфільмы. «Небяспечная экспедыцыя», «Пра Веру і Анфісу», «Багданчык і барабан».
**09.05** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**10.00** «Гарадок».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Толькі Высоцкі. Аўтапартрэт». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 5, «Куля для паўпрада». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Каір - 2» выклікае «Альфу». 1992 г.
**15.50** Юбілейны вечар Яўгенія Петрасяна «60 гадоў у абед». 2 частка.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** Фільм «Пярсцёнак з бірузой». 2008 г.
**23.25** Баявік «Штэмп». 1991 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** «Авіятары».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.15** Дэтэктыўны трылер «Праклён чорнага анёла».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**16.50** «Прафесія-рэпарцёр».
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**20.45** «Галоўны герой».
**21.50** «Жонкі Высоцкага». Відэафільм.
**22.40** Трылер «Мсціўец».
**00.20** Драма «Адрыў».

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 7-ы. Прамая трансляцыя.
**13.15** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Жанчыны. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Кіцбюэль). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.00** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Мужчыны. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**16.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Паказальны выступ. Прамая трансляцыя.
**18.00** Боўлінг (шары). Чэмпіянат свету ў памяшканні (Норфолк, Вялікабрытанія). Мужчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.30** Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак свету ў Канадзе (Ванкувер). HS 140.
**20.30** Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак свету ў Канадзе (Ванкувер). HS 140. Прамая трансляцыя.
**22.15** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**22.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Фінляндыі (Хельсінкі). Паказальны выступ.
**00.30** Боўлінг (шары). Чэмпіянат свету ў памяшканні (Норфолк, Вялікабрытанія). Мужчыны. Фінал.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прописам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.
____________________ (сумма прописью)
Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11
От кого ____________________
Адрес ____________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КІНО

# СУПРАЦІЎ: ЗА І СУПРАЦЬ

Іван БІЧ

**16 студзеня ў сусветны пракат выходзіць фільм «Супраціў» («Defiance») рэжысёра Эдварда Цвіка. Падзеі ў карціне адбываюцца ў Беларусі падчас другой сусветнай вайны.**

Прэм'ера «Супраціву», якая адбылася 31 снежня ў Лондане і Лос-Анжэлесе, мела дастаткова гучны рэзананс. Нічога дзіўнага: у ролі аднаго з галоўных персанажаў зняўся акцёр, які іграе славутага Джэймса Бонда.




Фільм зроблены па матывах кнігі Нехама Тэкса, прафесара сацыялогіі з ЗША, «Партызаны Бельскія», якая ў сваю чаргу базіруецца на рэальнай гісторыі, што мела месца каля Навагрудка ў часы нямецкай акупацыі. На працягу 1943–1944 гадоў у Налібоцкай пушчы дзейнічаў атрад партызан, які галоўным чынам складаўся з мясцовых яўрэяў. Яго лідэрамі былі браты Бельскія: Тувія, Азаель і Аляксандр (Зус).

Да вайны яны займаліся сельскай гаспадаркай. Калі ў верасні 1939-га прыйшлі Саветы, Бельскія падтрымалі новы рэжым. Пасля прыходу нацыстаў сям'я трапіла ў яўрэйскае гета, якое месцілася ў Навагрудку. Браты здолелі збегчы з палону і разам з іншымі ўцекачамі заснавалі партызанскі атрад. Камандзірам атраду быў Тувія Бельскі (яго іграе Крэйг), які меў вайсковы досвед як былы жаўнер польскай арміі. Акрамя таго ў юнацтве ён быў актывістам моладзевага сіяніцкага руху. Тувія рэкрутаваў кадры сярод яўрэяў Навагрудчыны. У выніку да яго ў лес перабралася каля тысячы чалавек, у тым ліку жонкі і дзеці. Узнік сапраўдны горад з зямлянак. Тут дзейнічалі школа, бальніца, пякарня, майстэрні. У лагеры была нават свая турма і судовыя органы.

Атрад Бельскіх актыўна змагаўся з паліцыяй, сябрамі якой як правіла былі беларусы і палякі, ды нямецкімі вайсковымі часткамі. Адпаведна савецкім гістарычным крыніцам, байцы Бельскіх забілі каля 400 фашыстаў і іх саюзнікаў. Акупацыйная адміністрацыя нават прапанавала за галаву Тувіі ўзнагароду ў сто тысяч акупацыйных марак. У 1943 годзе немцы правялі супраць партызан вялікую аперацыю, аднак тыя здолелі выйсці з акружэння. Бельскія ўваходзілі ў сетку савецкай партызанкі, хаця з боку яе штабу былі спробы распусціць атрад. Так ці інакш, атрад Бельскіх захаваў сваю яўрэйскую ідэнтычнасць, што дазваляе гісторыкам лічыць яго самым буйным фармаваннем яўрэйскага антыфашысцкага супраціву ва ўсёй Еўропе.

Улетку 1944 года, калі пачалося вызваленне, атрад Бельскіх разам з іншымі мясцовымі партызанскімі атрадамі, якія ўваходзілі ў партызанскае аб'яднанне імя Калініна, трыумфальна прамаршыраваў па Навагрудку. Далейшы лёс братоў Бельскіх склаўся па-рознаму. Азаель пайшоў у Чырвоную армію і быў забіты падчас штурму Кёнігсберу. Тувія і Зус прынялі польскае грамадзянства, што дазволіла ім выехаць у Палесціну. Пасля абодва пераехалі ў ЗША, дзе і памерлі напрыканцы 70-х.

Гэта гісторыя і пакладзеная ў аснову сюжэту фільма.

Фільм, тым больш з удзелам Даніэля Крэйга, проста не мог абысціся без рознага кшталту акцёрскіх скандалаў.

Крэйгу, як піша бульварная прэса, вельмі цяжка давалася руская мова. На здымачнай пляцоўцы ўсе каталіся ад смеху, калі ягоны герой Тувія Бельскі патрабаваў ад савецкага камандзіра медычную дапамогу фразай «Йа катъегорически настайиваю!»

Акцёры — сярод іх былі беларусы, і нават студэнты Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, — спрачаліся з рэжысёрам, як павінны выглядаць тыя ці іншыя сцэны. Яны не маглі пагадзіцца, што той бачыць партызан у адрыве ад нацыянальнага беларускага каларыту.

Аднак фільм выклікаў куды больш палітычных скандалаў.

Так, ізраільская прэса палічыла карціну неглыбокай. На яе думку, трагедыя яўрэяў Беларусі аказалася пераведзенай у фармат фільмаў разраду «фікшэн».

Яшчэ больш негатыўная рэакцыя на карціну была ў Польшчы. Некаторыя польскія гісторыкі лічаць, што група Бельскіх удзельнічала ў так званай «налібоцкай разні». У маі 1943 года гарадок Налібоцкае з пераважна польскім насельніцтвам быў атакаваны партызанамі. Акрамя паліцаяў загінула шмат мірных людзей. Польскі інстытут народнай памяці называе лічбу 128 чалавек. У Варшаве сцвярджаюць, што з самага пачатку атака была накіраваная супраць жыхароў польскага паходжання. Яны пастаўлялі кадры для Арміі Краёвай (АК), чыя атрады актыўна дзейнічалі ў гэтым раёне. Прыкладна ў той жа час савецкае кіраўніцтва прыняло рашэнне пра ліквідацыю структур АК у Заходняй Беларусі, што прывяло да сутычак паміж удзельнікамі польскага і савецкага падполля. Дарэчы, АК для барацьбы з партызанамі нейкі час нават супрацоўнічала з немцамі. Гісторыі дасюль спрачаюцца — удзельнічала група Бельскіх у падзеях у Налібоцкім пагроме або не.

Перадавы артыкул у вядучай польскай газеце «Gazeta Wyborcza» крытыкуе фільм за неадэкватны імідж партызанскага руху. У фільме партызаны суткамі змагаюцца з акупантамі. На думку аўтара артыкулу, партызанка ставіла перад сабою перш за ўсё задачу элементарнага выжывання, а не актыўнага супраціву.

Нарэшце, польскім гісторыкам не спадабалася ў карціне трактоўка тагачаснага Навагрудку як гораду, дзе на той час жылі выключна яўрэі і беларусы. Між тым, адпаведна даваенным дадзеным, тут дамінавалі яўрэі і палякі. Ігнараванне польскага элементу таксама праяўляецца ў мове, на якой размаўляюць акцёры «Супраціву». Жыхары Навагрудчыны, калі верыць стваральнікам фільму, гавораць выключна па-руску або па-беларуску. Сапраўды, нельга не прызнаць, што польская мова была вельмі распаўсюджаная ў тыя часы на Навагрудчыне.

Праўда, ганарыцца тым, што ў карціне беларусы прадстаўлены як дамінуючы ў краі этнас, нам таксама не выпадае. Тыя беларусы, хто ўжо паглядзеў фільм, лічаць, што іх суайчыннікам штучна навязалі вобраз антысемітаў. На адным з беларускіх інтэрнэт-форумаў, прысвечаных фільму, скардзяцца: «Там (у фільме) беларусаў выставілі поўнымі антысемітамі. Гэта ёсць абсурд, паколькі выключна ў Беларусі і існавалі яўрэйскія партызанскія атрады. А партызанскі атрад, тым больш такі буйны, не мог існаваць без падтрымкі або як мінімум добрага стаўлення мясцовага насельніцтва. Вы можаце ўявіць сабе падобны партызанскі атрад недзе ў Заходняй Украіне? Праўда, што чакаць ад Галівуду...»

Па першых рэакцыях беларускіх гледачоў можна прагназаваць, што фільм абавязкова ўздыме пытанне адносін яўрэяў і савецкіх партызан. Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што партызанскія камандзіры адмаўляліся браць у атрады яўрэяў, каб не справакаваць гнеў фашысцкай адміністрацыі. Апошняя мусіла выконваць загад аб татальным знішчэнні яўрэйскага народу.

На мой погляд, «Супраціў» не здольны прэтэндаваць на канчатковую ісціну. Аднак ягоны пазітыў відавочны. Ён ужо выклікаў палеміку, якая дазволіць не так проста і прымітыўна глядзець на мінулае, як напісана ў савецкіх падручніках гісторыі. Не кажучы пра тое, што фільм дапаможа беларусам узгадаць, што іх продкі былі героямі, рэакцыяй якіх на ціск і прыгнёт быў супраціў.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Калі ўзгадаць пра тое, што беларускі аўтакрат Аляксандр Лукашэнка атрымлівае газ за частку таго кошту, які быў прапанаваны Украіне, нельга пазбавіцца ад пачуцця, што Масква выкарыстоўвае свае газавыя пастаўкі ў палітычных мэтах. У такім разе наступствы канфлікту не будуць абмежаваныя ўнутранай палітыкай ва Украіне.

**«Vorwaerts» (Германія)**

Беларусі, напрыклад, адмова прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі (гэтага патрабавала Масква) не замінае атрымліваць расійскі крэдыт і адносна танны газ на 2009 год (канчатковая цана пакуль не вядомая). Пры гэтым прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка перадаў пытанне аб прызнанні парламенту, адклаўшы яго разгляд да вясны. Між тым, як думаюць назіральнікі, афіцыйны Мінск проста атрымаў адтэрміноўку і магчымасць захаваць свой твар (быццам Беларусь не паддалася ціску Масквы і захавала незалежнасць сваёй знешняй палітыкі).

**«Лента.ру» (Расія)**

Пасол Украіны Ігар Ліхавы заявіў, што ў бліжэйшы час адбудзецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з украінскім прэзідэнтам Віктарам Юшчанкам. Пры гэтым пасол шмат казаў пра газавы шантаж з боку Расіі і неабходнасць аб'яднання краін-транспарцёраў. Мясцовыя эксперты адзначылі, што інфармацыйныя паведамленні беларускага дзяржаўнага тэлебачання сталі сапраўдны плюралістычнымі — побач з расійскімі заявамі пра адказнасць у канфлікце Украіны пачалі з'яўляцца заявы ўкраінскіх палітыкаў аб газавым шантажы з боку РФ.

**«Независимая Газета» (Расія)**

Сітуацыя, якая ўзнікла пасля 2 студзеня, дае мясцовым назіральнікам і экспертам магчымасць казаць пра каласальнае падзенне рэйтынгу існуючай улады ў асобе Аляксандра Лукашэнкі. Шкада, што ў Беларусі няма незалежных сацыялагічных інстытутаў, якія маглі б замераць ступень гэтага падзення.

**«Взгляд» (Расія)**

Рэйтынг Лукашэнкі незалежныя сацыёлагі называюць «тэфлонавым»: якія б ветры не дзьмулі, папулярнасць Бацькі такая, як і была. І ўсё роўна свая кашуля аказалася бліжэй да цела: пачуўшы нядобрае, у апошнія месяцы года народ пачаў пераводзіць рублёвыя дэпазіты ў валютныя або ўвогуле хаваць валюту, як заявіў правадыр, «пад матрац». Абвал валюты адштурхнуў на задні план сітуацыю з пастаўкай расійскага газу ў Беларусь. Кошт пытання на 2009 год дасюль не вядомы. У мясцовых экспертаў дзве версіі: Мінск і Масква не дамовіліся, і газавая вайна пачнецца пасля заканчэння ўкраінскай эпапеі. Іншы варыянт: кошт не называецца, каб не даць Кіеву дадатковых козыраў у супрацьстаянні з Масквой.

**«Обком» (Украіна)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЧЭХІЯ

Чэхія, якая старшынствуе ў Еўрасаюзе, мае намер склікаць канферэнцыю краін-донараў па сектары Газа, дзе ўжо больш за два тыдні ізраільская армія праводзіць ваенную аперацыю.

Як паведамляе прэс-служба чэшскага старшынства, тэмай сустрэчы павінна стаць складаная гуманітарная сітуацыя ў палесцінскім анклаве і доўгатэрміновыя перспектывы яго рэканструкцыі. Дата канферэнцыі пакуль не вызначана.

12 студзеня Савет ААН па правах чалавека прыняў рэзалюцыю, у якой асуджаецца ваенная аперацыя Ізраіля ў сектары Газа.

У ноч на 13 студзеня ізраільскія войскі ўзмацнілі націск на палесцінскія пазіцыі ў сталіцы сектара Газа, уваходзячы ў горад з новых напрамкаў і прасоўваючыся ўглыб гарадскіх кварталаў.

### ІСПАНІЯ

Нацыянальны музей Прада (Мадрыд) і іспанскі філіял кампаніі Google 13 студзеня запусцілі інавацыйны праект «Шэдэўры Прада ў Google Earth», перадае РИА «Новости».

«Тры грацыі» Рубенса, «Мяніны» Веласкеса, «Сад зямных уцехаў» Босха, «Зняцце з крыжа» ван дэр Вейдэна, «Аўтапартрэт» Дзюрэра — усяго 14 палотнаў — цяпер можна разгледзець у найдрабнейшых дэталях дзякуючы найноўшым тэхналогіям, што прымяняюцца праграмай Google Earth.

На ажыццяўленне праекта пайшло больш як паўгода. Першыя тры месяцы прафесійныя фатографы па начах здымалі разбітыя на квадраты дэталі кожнай карціны. Толькі па палатне Босха было зроблена 1,6 тысячы фатаграфій, а ўсяго па 14 карцінах — больш як 8,2 тысячы здымкаў. Затым кампутаршчыкі збіралі з гэтых найдрабнейшых фатаграфій своеасаблівы пазл у адзінае цэлае. Апошні месяц пайшоў на наладку самой праграмы.

Дзякуючы найноўшай тэхналогіі назірання Google павелічэнне кожнай карціны стала магчыма да 14 тысяч мегапікселяў.

Дырэктар Прада Мігель Сугаса зазначыў, што музеі павінны быць зацікаўлены ва ўкараненні найноўшых тэхналогій, паколькі іх асноўная задача — не толькі захоўваць творы мастацтва для будучых пакаленняў, але і папулярызаваць мастацтва.

### ЛАТВІЯ

Апазіцыйная партыя «За правы чалавека ў адзінай Латвіі» («ЗаПЧЕЛ») мае намер звярнуцца ў Канстытуцыйны суд краіны, каб адмяніць папраўкі, якія павялічваюць штрафы за выкарыстанне ў прафесійнай дзейнасці замежнай мовы.

Як паведамляе РИА «Новости», прэзідэнт Латвіі Валдзіс Затлерс зацвердзіў прынятыя парламентам краіны папраўкі да Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія павялічваюць памеры штрафаў за выкарыстанне поруч з дзяржаўнай (латышскай) мовай замежнай (на практыцы — рускай). Штрафы могуць дасягаць 50 латаў (100 долараў).

Раней МЗС Расіі асудзіў рашэнне латвійскага прэзідэнта і ўказаў, што падобныя дыскрымінацыйныя дзеянні парушаюць агульнапрызнаныя ў Еўропе правы нацыянальных меншасцей.

На мінулым тыдні прэзідэнт Латвіі Валдзіс Затлерс прыняў рашэнне не размаўляць з рускамоўнымі журналістамі на рускай мове. «У Латвіі адна дзяржаўная мова — латышская», — патлумачыў В. Затлерс.

### ЛІТВА

Еўракамісар па энергетыцы Андрыс Піебалгс у ходзе тэлефоннай размовы 12 студзеня прапанаваў міністру замежных спраў Літвы Вігаўдасу Ушацкасу «засяродзіцца на будаўніцтве ўласнай новай атамнай электрастанцыі, якая магла б таксама вырашыць і энергетычныя патрэбы Беларусі». Пра гэта паведамляе прэс-служба МЗС Літвы.

В. Ушацкас азнаёміў еўракамісара з вынікамі візіту ў Рыгу, дзе 9 студзеня было вырашана паскорыць рэалізацыю праекта Swedlink — па стварэнні агульнага энергетычнага рынку краін Балтыі. Паводле слоў міністра, Літва гатова да працы.

У сваю чаргу еўракамісар папрасіў прадставіць Еўракамісіі канкрэтную інфармацыю пра праект.

А. Піебалгс таксама зазначыў: «Няма ніякіх сумненняў у тым, што для развіцця адносін з ЕС Беларусь павінна будзе звярнуць увагу на пазіцыю ЕС па будаўніцтве АЭС на мяжы з аб'яднанай Еўропай».

### СЛАВАКІЯ

12 студзеня Еўракамісія папярэдзіла Славакію, што планы па рэактывацыі атамнай электрастанцыі ў Яслоўску Багуніцы супярэчаць пагадненню пра ўступленне краіны ў ЕС.

Як паведамляе агенцтва «Франс Прэс», прэм'ер-міністр Славакіі Роберт Фіцо заявіў, што аднаўленне працы АЭС дазволіць краіне пазбегнуць энергетычнага крызісу. У той жа час, прызнаў ён, гэты крок пойдзе ўразрэз з пагадненнем пра ўступленне ў ЕС.

Варта зазначыць, што ў сувязі з канфліктам паміж Расіяй і Украінай, у выніку якога былі поўнасцю спынены пастаўкі расійскага газу праз украінскую тэрыторыю ў ЕС, улады Балгарыі таксама разглядаюць магчымасць запуску старых рэактараў савецкага ўзору.

Будаўніцтва АЭС замест Ігналінскай АЭС, якая рыхтуецца да спынення, плануе Літва. Магчыма, праект будзе міжнародны, да яго далучацца таксама Латвія, Польшча і Эстонія. Між тым, польскае кіраўніцтва заявіла пра планы да 2020 года пабудаваць АЭС на сваёй тэрыторыі.

Для абмеркавання планаў Беларусі па будаўніцтве АЭС на мяжы з Літвой літоўскае кіраўніцтва прапанавала падключыць Еўракамісію. Вільнюс апасаецца, што беларускі праект будзе распрацоўвацца недастаткова празрыста і без уліку ўсіх стандартаў ЕС.

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ГАЗАВАЯ ВАЙНА: ПОГЛЯД З УКРАІНЫ

**З пануючых у эфіры расійскіх медыя мы ўсе ведаем пра тое, што каварная Украіна крадзе ў Расіі газ, прымушае замярзаць Еўропу, зрывае перамовы з «Газпрамам». А якія аргументы ва ўкраінскіх палітыкаў? Журналіст «НЧ» Алег Новікаў піша з Кіева.**




Дастаткова акрэсленай пазіцыі ўкраінскай палітычнай эліты адносна прыроды і вытокаў цяперашняй газавай вайны не прагладаецца: палітычны клас нашай паўднёвай суседкі моцна падзелены на фракцыі: адміністрацыя прэзідэнта, урад Юліі Цімашэнка, больш дробныя акцёры кшталту некаторых ведамстваў. У мясцовай прэсе пішуць, што на транзіце газу таксама грэюць рукі камерцыйныя структуры, звязаныя з тым ці іншым палітыкам, якія лабіруюць іх інтарэсы. Такія абвінавачанні былі высунутыя, напрыклад, супраць Віктара Ющанкі. Кіраўнік краіны ў адказ быў вымушаны заявіць, што ў будучым такія інсінуацыі закончацца для іх аўтараў позвай у суд.

Да таго ж усе згаданыя палітычныя гульцы знаходзяцца ў стане перманентнага канфлікту. Часам узнікае такое ўражанне, што галоўная стаўка для ўкраінскага палітыкуму — не прымальны кошт на расійскі газ, а захаванне шансаў у барацьбе за прэзідэнцкае крэсла на выбарах наступнага года.

Так, перадавы артыкул друкаванага органа Юліі Цімашэнка, газета «Вечерні Вісті» за мінулую сераду пачынаецца наступнай тырадай: «Палітыка прэзідэнта прывяла да таго, што ў самы разгар зімы краіна пагружаецца ў холад. Няма цяпла ў школах, дзіцячых садках, бальніцах, прыпыняюць працу прадпрыемствы. Украіна ідзе да катастрофы сямімільнымі крокамі, аднак гарант наш, як вядома, дамовіцца з Расіяй не здольны».

Медыя, падкантрольныя «Нашай Украіне», адказваюць на напады Цімашэнка падобнай манетай.

Шмат хто лічыць, што гучная антыгазпрамаўская навагодняя заява прэзідэнта і прэм'ера была падпісана Цімашэнка з-за пагрозы канчаткова страціць электарат Заходняй Украіны.

Быццам спачатку яна хацела згуляць на тым, што каманда Ющанкі не здолела дамовіцца з Масквой, асабіста накіравацца ў Белакаменную і прывезці адтуль доўгачаканы кантракт аб пастаўках газу. І быццам, калі ўсё было гатова да адлёту, Юліі паклалі на стол дадзеныя апошніх апытанняў папулярнасці палітычных сілаў. Адпаведна ім, БЮТ вельмі моцна страціў у рэйтынгу, асабліва на Заходняй Украіне. Сама Цімашэнка ў выпадку выбараў магла разлічваць толькі на 17 працэнтаў (два гады таму яе БЮТ сабраў 28 працэнтаў). Прычына — карозія электаральнай базы БЮТ, які апошнім часам спрабуе знайсці падтрымку таксама на Усходняй Украіне. Апошняе прымушае Цімашэнка больш мякка ставіцца да Расіі, што не падабаецца нацыяналістычнаму электарату. Давялося Цімашэнка быццам рэабілітавацца ў вачах заходніх украінцаў і падтрымаць Ющанку.

Так ці інакш, у прынцыпе негатыўнай пазіцыі супраць забабонаў Мілера трымаюцца ўсе партыі аранжавага лагеру, аднак, здаецца, кожны з суб'ектаў кааліцыі Майдану жадае набраць сабе ў гэтай сітуацыі як мага больш палітычных пунктаў.

Партыя «Наша Украіна», якая відавочна робіць стаўку на галасы нацыяналістаў, апошнім часам сапраўды заняла абсалютна радыкальную пазіцыю. Яе сябры дагаварыліся да таго, што раскрылі цэлую змову Масквы супраць Кіева. Адпаведна словам палітыкаў, якія выкрылі планы Крамля, галоўнай задачай Пуціна было праз газавы канфлікт справакаваць у Данбасе сапраўднае сепаратысцкае вайсковае паўстанне. Узначаліць мяцеж мусілі быццам бы камуністы.

Гледзячы на сытыя і задаволеныя твары бонз кампартыі, што даўно інтэграваная ў схемы раздзелу дзяржаўных сродкаў (адзін з сяброў КПУ займае пасаду віцэ-міністра ва ўрадзе Цімашэнка), ад такіх словаў хочацца смяяцца. КПУ відавочна не зацікаўленая ў выхадзе сітуацыі з-пад кантролю. Ёй як партыі Зюнагава ў Расіі ўтульна ў нішы галоўнай левай апазіцыйнай сілы, якая прыносіць ім стабільныя месцы ў Радзе і хабары ад алігархаў за правільнае галасаванне ў парламенце.

Што да галоўнай апазіцыйнай партыі краіны — «Партыі Рэгіёнаў», яна спрабуе скарыстацца момантам і вельмі гучна патрабуе адстаўкі Цімашэнка і імпічменту Ющанкі. Праўда, для тых, хто нешта разумее ва ўкраінскай палітыцы, відавочна, што гэта пусты лямант на публіку. «Рэгіёны» не маюць большасці ў парламенце і іх пагрозы абсалютна бяспечныя для аранжавых.

Аднак нават калі б Януковіч і кампанія і дабіліся свайго — скінулі аранжавы кабінет — наўрад ці яны вырашыліся задаволіць патрабаванні «Газпраму» аб передачы ўкраінскага газавага транзіту ў арэнду Расіі, або плаціць па 450 долараў за тысячу кубаметраў. Якой б знішчаючай рыторыкай Януковіч не атакаваў урад, задаволіць апетыты Масквы ён не можа. Пры ўсіх катаклізмах ва ўкраінскай грамадскай думцы дамінуе незалежніцкая пазіцыя.

Галоўны аргумент Украіны ў канфлікце дасюль выглядае дастаткова салідным: Расія аднабакова парушыла пункты мемарандуму пра графік росту коштаў на газ. Адпаведна яму, у гэтым годзе максімум росту мусіў быць прыблізна 210 долараў за тысячу кубаметраў. Сума 450 долараў, якую патрабую Масква, проста фантастычная. Такіх грошай не плацяць «Газпраму» нават самыя развітыя краіны Еўропы.

Што далей? У любым выпадку большасць экспертаў прагназуюць, што ў бліжэйшы час сітуацыя захаваецца. Украіна мае запасы газу, дастатковыя, каб пратрымацца ў газавай блакадзе прыблізна год. Відавочная агрэсіўная палітыка Масквы, якая адкрытым тэкстам кажа, што хоча працаваць з іншым украінскім урадам, дазваляе Кіеву неяк маральна кансалідаваць насельніцтва. У сваю чаргу, Масква зацікаўленая фармальна заставацца ў канфлікце з Кіевам на час крызісу расійскай эканомікі, каб гульнёй у нацыяналістычную карту кампенсаваць насельніцтву матэрыяльныя праблемы.

МЕРКАВАННЕ

# Казахстан: АХВЯРАЙ КРЫЗІСУ СТАЎ КОЖНЫ

**Як ні дзіўна гэта гучыць, але сярод валют краін СНД ёсць такія, якія нягледзячы на крызіс застаюцца стабільнымі. Сярод іх казахскі «тэнге». За кошт чаго ўтрымліваецца курс? Пра гэта і пра іншыя аспекты крызісу ў Казахстане карэспандэнт «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Андрэем Грышыным, казахскім журналістам і праваабаронцам.**



***— Як праяўляецца крызіс у эканоміцы і грамадскім жыцці Казахстана? Якія настроі ў грамадстве?***

— Здаецца, што ахвярай крызісу стаў кожны. Урад доўгі час пераконваў, што ў нас усё нармальна, што Казахстан ідзе па свайму ўнікальнаму шляху развіцця і таму крызіс краіну не закране. Аднак жа закрануў. Шэраг буйных прадпрыемстваў краіны зараз на мяжы закрыцця або значна скарацілі вытворчасць. Напрыклад, металургічны камбінат у Карагандзе. Рабочых адпраўляюць у прымусовыя адпачынкі. А гэта галоўныя прадпрыемствы для ўсёй мясцовай інфраструктуры. Другая галіна, дзе ўсё амаль згарнулася, — будаўніцтва. Усё гэта паўплывала на банкаўскую сферу. У банках людзі доўгі час трымалі грошы і бралі крэдыты пад тую ж пабудову кватэр. У сваю чаргу банкі бралі крэдыты на Захадзе. Аднак усё гэта навярнулася за лічаныя месяцы. Прыкладна 25 працэнтаў бізнесу ўжо зачынілася. З-за дрэннага эканамічнага становішча пачалі рэзаць заробкі. Апошні ўдар: папаўзлі ўніз цэны на нафту. З яе экспарту галоўным чынам фармаваўся бюджэт. Цяпер узніклі праблемы ў бюджэтнікаў і пенсіянераў. Каб ратаваць банкі, дзяржава палезла ў асабістыя пенсійныя фонды, і шмат хто стаў са здзіўленнем канстатаваць, што яго грошы пачалі кудысьці знікаць. Асобна можна сказаць пра злачыннасць. Яна неверагодна павялічылася. Паліцыя ў паніцы: злачынцамі становяцца тыя, хто звычайна раней сябраваў з законам. Галоўным чынам гэта былыя будаўнікі або гастарбайтэры з суседніх краін. Пасля васьмі гадзін вечара стала небяспечна выходзіць на вуліцы Алма-Аты. А літаральна два дні таму ўвесь горад ускалыхнуў такі выпадак: злачынцам стаў чарнаскуры. Ён прыпыніў машыну з дапамогай драбавіка, забраў рэчы вадзіцеля і збег. Такога кур'ёзу яшчэ не было.

***— Сітуацыя ў Казахстане лепшая або горшая ў параўнанні з іншымі рэспублікамі Сярэдняй Азіі?***

— Пакуль лепшая, бо яна заўсёды была лепшай. Аднак тут ёсць такі момант: суседнія краіны не былі так моцна завязаныя на замежных крэдытах, а банкаўская сфера Казахстана лічылася адной з лепшых у СНД. Вось чаму заходнія банкі ахвотна давалі казахскім калегам грошы ў доўг. Цяпер яны патрабуюць іх вяртання. А плаціць няма чым. З іншага боку, нашы суседзі і так, па шчырасці, дрэнна жывуць. Па вялікаму рахунку, там нічога не змянілася ў апошнія часы, хіба што цэны выраслі. А Казахстан апошнія тры-чатыры гады жыў вельмі добра, і цяпер цяжка прызнаваць, што ўсё гэта заканчваецца.

***— Беларускі ўрад доўгі час адмаўляўся прызнаваць факт рэцэсіі. Нават зараз дзяржаўная прапаганда сцвярджае, што слова «крызіс» не павінна ўжывацца ў дачыненні да Беларусі. А як паводзяць сябе казахскія ўлады?***

— Як я ўжо казаў, даўгі час урад рабіў выгляд, што ўсё добра. Аднак калі нават апошні лох у эканоміцы стаў разумець, што справа кепская, чыноўнікі прызналі: так, крызіс ёсць. І нават выступілі з некаторымі мерамі, якія, аднак, былі вельмі познія. У сваіх апошніх выступах прэзідэнт заклікаў чыноўнікаў да эканоміі. Хаця ў бюджэтнай галіне панічная эканомія на ўсім, што можна, ужо назіраецца.

***— Чаму Казахстан не праводзіць дэвальвацыю тэнге? Ці ёсць чуткі наконт магчымай дэвальвацыі, і, адпаведна, ці назіраецца паніка каля пунктаў абмену валют?***

— Чуткі — абавязковая складаная казахскай палітыкі. Пра дэвальвацыю размаўляюць даўно, і нават называліся канкрэтныя тэрміны — у сярэдзіне снежня пасля Дня незалежнасці. Аднак пакуль усё нармальна. Панікі не назіраецца. Народ проста прызвычаіўся да чутак і не спяшаецца пасля чарговай плёткі кідацца набываць соль і мыла. Пакуль дзяржава выкарыстоўвае ўнутраныя валютныя рэзервы і тэнге трымаецца. Наколькі гэтых рэсурсаў хопіць, я сказаць не магу.

***— Як паводзіць сябе ў новых умовах палітычная апазіцыя? Ці здолела яна ўзняць свой рэйтынг? Ці не спрабуюць улады знайсці нейкі кампраміс з апанентамі, каб не дапусціць палітызацыі магчымых пратэстаў?***

— У нас пайшлі іншым шляхам. Каб апазіцыя не згуляла на пратэстных настроях, Астана атакавала першай. Супраць усіх палітычных лідэраў былі ўзбуджаны крымінальныя справы аб укрыванні злачынцы. Сем гадоў таму з Казахстану ва Украіну збег адзін з палітычных праціўнікаў Назарбаева, якога абвінавацілі на радзіме ў забойстве. Украіна, дарэчы, палічыла казахскія абвінавачанні не дастатковымі. Так ці інакш, у той час сем лідэраў апазіцыі звярнуліся да афіцыйнага Кіева з просьбай не выдаваць уцекача. Цяпер ім нечакана прыгадалі той ліст у Кіеў, палічыўшы, што ён падпадае пад артыкул «дапамога ва ўкрыванні злачынцы». Шэсць падпісантаў ужо чакаюць суда. Адзін на момант узбуджэння справы знаходзіўся ў Манголіі, і цяпер ён вяртацца не спяшаецца.

***— Ці магчымы пратэсты? Калі так, то хто патэнцыйна можа іх узначаліць? Якія патрабаванні могуць высунуць іх удзельнікі?***

— З вялікім скепсісам можна паверыць у тое, што народ падымецца супраць прэзідэнта. Хіба што падобнае можа адбыцца ў атачэнні кіраўніка дзяржавы. Праціўнікаў у яго хапае нават у сваёй сям'і. Аднак перспектыва народнага бунту мала рэальная.

***— Ці адлюстраваўся нейкім чынам крызіс на знешнепалітычных арыенцірах Астаны?***

— Прыярытэты ў гэтай галіне засталіся старымі: адсутнасць нейкіх вызначаных арыенціраў пры некаторых сантыментах на адрас Расіі. Праўда, з боку самой Расіі былі абвінавачанні ў тым, што Казахстан быццам збіраецца даць згоду на размяшчэнне на сваёй тэрыторыі баз NATO. Аднак казахскі МЗС аператыўна заявіў, што гэта лухта. Шчыра кажучы, на гэтым усё і скончылася.

***— Што кажуць казахі пра газавую вайну Украіны і Расіі?***

— Амаль нічога. У асноўным нашы выданні цытуюць расійскую прэсу. На самай справе для Казахстану гэта нешта далёкае і не актуальнае.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АСАМА БЕН ЛАДЭН



Тэрарыст нумар адзін атрымаў сімвалічную перамогу над Захадам. У Парыжы пачаўся працэс над Хрысціянам Ганчанскім, былым заўзятым каталіком, які перайшоў у іслам і нават прыняў удзел у падрыхтоўцы тэракту Аль-Каіды ў Алжыры, у выніку якога загінуў 21 чалавек. Польшча, асабліва каталіцкая частка, у шоку. Як такое магло здарыцца? Ганчанскі, якому зараз 44 гады, нарадзіўся на поўдні краіны і атрымаў добрую каталіцкую адукацыю. Суседзі і родзічы, якія, праўда, цяпер адмаўляюцца публічна прызнаваць сябе роднымі Хрысціяна, кажуць, што ён не прапускаў ніводнай імшы ў мясцовым касцёле. Яго трансфармацыя ў ісламіста пачалася ў нямецкім Дуйсбургу, дзе ён вучыўся на металурга. Кантакты з мясцовая камунай мусульман закончыліся шлюбам з жанчынай арабскага паходжання. У 1986 годзе Ганчанскі прыняў іслам і абраў сабе новае імя — Ібрагім. Аднак гэтага яму было мала. Хрысціян-Ібрагім паехаў у Саудаўскую Аравію, каб устанавіць сувязь з чачэнскім супраціўам. Да Чачні ён, аднак, так і не дабраўся, затое аказаўся ў Пакістане, дзе стаў асабістым паверапым Асамы (лічаць, што ён выконваў функцыі кур'ера па пастаўках правадыру тэрарыстаў лекаў). З часам яму даверылі больш важныя аперацыі, кшталту арганізацыя тэракту ў Алжыры. Аднак пазбегнуць пакарання Ганчанскаму не ўдалося: хутка яго злавілі ў парыжскім аэрапорце. Нягледзячы на арышт Ганчанскага, афіцыйная Варшава занепакоена гэтым выпадкам. Як прызнаў афіцэр польскай разведкі, Ганчанскі — не выключэнец-адзіночка. У Польшчы ёсць яшчэ палякі, якія прынялі іслам і з'яўляюцца тайнымі агентамі Бен Ладэна.

### ТАІП ЭРДАГАН




Прэм'ер-міністр Турцыі, лідэр ісламіцкай Партыі Справядлівасці парушыў адно з галоўных табу турэцкіх палітыкаў. Ён не толькі прызнаў існаванне курдскага этнасу, аднак і дазволіў стварэнне першага курдскага каналу тэлебачання. З самага пачатку заснавання Турцыі курды лічыліся часткай турэцкай нацыі, а іх мова — так званым горным турэцкім дыялектам. Адукацыя на курдскай мове была забароненая. Нават публічныя выступы на ёй пасля перавароту мелі наступствам крымінальную адказнасць. Два гады таму ўлады ўпершыню дазволілі класы з курдскай мовай навучання і трансляцыі на курдскай мове ў рамках дзяржаўнага радыё. І вось цяпер чарговы прарыў — асобны курдскі канал тэлебачання. Праўда, самі курдскія актывісты вельмі скептычна ставяцца да ініцыятывы ўраду. На іх думку, новы тэлеканал будзе займацца выключна дзяржаўнай прапагандай. Пра рэальнае паляпшэнне сітуацыі казаць цяжка (напрыклад, нават у гарадах з высокім працэнтам курдскага насельніцтва падчас муніцыпальных выбараў забараняецца агітаваць на курдскай мове). Спецыялісты пагаджаюцца з такімі ацэнкамі. Анкара так ці інакш была вымушаная нешта рабіць у гэтай галіне, каб адцягнуць увагу курдскай аўдыторыі ад двух спадарожнікавых каналаў, якія вяшчаюць з Даніі і Швецыі. Абодва фінансуюцца Курдскай працоўнай партыяй, якая выступае за стварэнне самастойнай курдскай дзяржавы. Акрамя таго хутка адбудуцца камунальныя выбары, і партыя Эрдагана павінна думаць пра тое, як завяваць электарат курдскіх правінцый.

### ЮРГЕН ЭЛЬЗАСЕР



Вядомы ў Германіі журналіст левых поглядаў, супрацоўнік газеты «Neue Deutschland» (выданне, блізкае да партыі былых усходненямецкіх камуністаў) — адзін з самых вядомых змагароў з антысемітызмам — нечакана для ўсіх радыкальна змяніў погляды і абвясціў пра стварэнне групоўкі «Народны фронт супраць фінансавага капіталу». Гэты самы фінансавы капітал, па словах Юргена, прадстаўлены выключна банкірамі яўрэйскага і англа-амерыканскага паходжання. Гэта яны сёння быццам свядома вядуць атаку на нямецкую эканоміку, развязаўшы ў краіне эканамічны крызіс. Па Юргену, змагацца з праклятымі супастатамі можна адзіным сродкам — стварыць моцную нацыянальную дзяржаву, якая нацыяналізуе ўвесь фінансавы сектар. Каб дасягнуць мэты, усе немцы павінны аб'ядноўвацца ў адзіны Народны фронт. Нягледзячы на тое, што аўтар праекту адмаўляецца афіцыйна супрацоўнічаць з неанацыстамі, апошнія ўспрынялі навіну аб заснаванні Фронту на ўра. Кіраўніцтва самай буйнай у краіне праварадыкальнай партыі Нацыянал-дэмакраты бачыць у ініцыятыве Эльзасера спробу пераадолець дуалізм правых і левых, а берлінская секцыя партыі ўжо прапанавала Юргену падтрымку. Адначасова рэдактар «Neuen Deutschland» ужо звольніў былога супрацоўніка. Хутчэй за ўсё, ініцыятыва Юргена моцна не паўплывае на палітыку ў ФРГ, аднак сам па сабе гэты ўчынак заслугоўвае ўвагі як праява тэндэнцыі. Некалькі гадоў таму аб сваіх перакананнях нечакана заявіў іншы культавы нямецкі лявак — Хорст Малер. Ён (былы баявік левай радыкальнай тэрарыстычнай групоўкі Фракцыя Чырвонай Арміі) пасля амністыі стаў нацыянал-дэмакратам і некалькі разоў быў асуджаны за публічную дэманстрацыю забароненых у краіне фашысцкіх сімвалаў і жэстаў.

▸ ПАДАРОЖЖА

# ГОРКІЯ СТАРОНКІ

Вячаслаў ДУБІНКА

**Тэлефонны званок ад Міхася Чарняўскага, археолага, гісторыка, літаратара, руплііўца на ніве нашай шматпакутнай спадчыны. Унушальны шэраг яго прац — навуковых, навукова-папулярных, мастацкіх — нядаўна папоўнілася невялікай па аб'ёму кніжкай «Як пошуг маланкі». Але за ёй гады пошукаў, збірання па крупіцах арыштаванай праўды. Міхась Чарняўскі запрасіў у падарожжа па знакавых мясцінах, каб перагарнуць унікальныя, незабыўныя старонкі Мядзельскага, Смаргонскага падполля 1948–1950 гадоў.**



Фота аўтара

Дзве родныя сястры былога падпольшчыка Юзіка Качэргі — Вераніка і Марыя. У цэнтры родзіч Юзіка — Сабковіч Віктар.




Памятны знак у Красным беражку.



Вёска Пажарцы — двор сястры Юзіка Качэргі — Веранікі.

...30 гадоў таму ўсё лета я падарожнічаў па Калыме з «лейкай і блакнотам», здымаючы Амахтонскую затоку, хрыбет Чэрскага, разбураныя баракі былых зняволеных — смяротнікаў, якія здабывалі золата ў Сусумане, Дэбіне, Палатцы. Патрапіў на сакрэтны аб'ект — возера Джэка Лондана, дзе тыя ж смяротнікі здабывалі ўранавую руду. За адну ноч 1940 года ахоўнікі застрэлілі тысячы зняволеных: не было чым карміць — накармілі кулямі.

Я не ведаў, што ў гэтыя гіблыя мясціны былі сасланы юнакі і дзяўчаты з Мядзельшчыны, за «недоносительство» на сваіх аднагодкаў. Краіна Савецаў гнала іх дарогай смерці ад Аймякона да Сусумана і Усць-Неры. У мясцовым музеі Ягаднага бачыў шыльдачку: «Шаг налево, шаг направо — смерть на месте!»

Высветлілася, што ў ціхманай, памяркоўнай Беларусі, у азёрным краі на Мядзельшчыне, на пачатку 1948 года ў правінцыйнай дзесяцігодцы ўзнікла падпольная апазіцыйная арганізацыя. Знайшліся адчайныя юнакі і дзяўчаты, якім балела душа за ганьбу іх бацькоў, за рабскі прыгон сялян, за калгаснае ярмо. Арганізатар і натхняльнік — вучань восьмага класа Расціслаў Лапіцкі — перакананы антыкамуніст, беларускі патрыёт.

Іх мужнасць здзіўляе. Што магла супрацьпаставіць імперыі зла, страху, хлусні купка юнакоў і дзяўчат... Супрацьпаставіць ваяўнічай, бязлітаснай імперыі, якая існавала па ваўчыных, бандыцкіх законах, праліла мора крыві невінаватых людзей.

Употай юнакі і дзяўчаты рыхтавалі ўлёткі, а ноччу, хаваючыся ад нядобрых вачэй, прымацоўвалі іх на сценах вясковых хат, на будынках райкаму і райміліцыі. Людзі, уставайце з каленяў! Не плаціце крыважэрных падаткаў — за кожнае пладовае дрэўца, за дробную хатнюю жыўнасць! Не ўступайце ў калгасы, супраціўляйцеся антынароднаму рэжыму! Смерць Сталіну! Падпольшчыкі планавалі і неверагоднае — узарваць ці падпаліць раённую друкарню.

Не на жарт перапалохаліся служкі імперыі, трымаючы ў руках ўзрыванебяспечныя ўлёткі. Імперыя «шчасця» абрынула на адчайных юнакоў і дзяўчат усю моц карнай сістэмы. Засады, налёты,ператрусы ў вясковых хатах, арышты, допыты, катаванні.

Наша дэлегацыя — а гэта супрацоўнікі акадэмічнага інстытута гісторыі, навукоўцы, студэнты, сябры мастацкай суполкі «Пагоня», пісьменнікі, журналісты, фотарэпарцёры — на «рафіку» рушыла па «маладзечанцы». Абмінаем сумнавядомыя «акопы Язэпа», кідаем позірк на агітгектары з танкеткамі, танкамі, палутаркамі, бліндажамі з кулямётамі. Тут які ўжо год запар ладзяцца пацешныя баі. «Нашы харобрыя байцы» гоняць паганых «фрыцаў» аж да Радашковіч, дзе ўсе дружна бяруць «наркомаўскія».

За Вілейкай прывецілі прыгожыя прысады вёскі Качаргі. Крочым па вясковых вуліцах, спыняемся на ўскрайку каля ўтульнай дагледжанай хаты, вокны якой узіраюцца на прыгожыя краявіды.

— Тут, на гарышчы хаты, юныя падпольшчыкі на старэнькай іншаземнай, пэўна трафейнай, друкарцы рыхтавалі ўлёткі, — распавядае Міхась Чарняўскі.

Нястомны даследчык згаданага падполля па каліўцу збірае весткі, аднаўляе забытыя імёны патрыётаў, выдаў дзве кніжкі, рыхтуе да друку новыя матэрыялы.

Згадваючы пра арышт хлопцаў і дзяўчат, пра катаванні падлеткаў, Міхась выцірае няпрошаную слязіну.

— Карнікі з органаў здзекаваліся, як нелюдзі, падлеткам выбівалі зубы, ламалі «дугой» рэбры, не грэбуючы самымі дзікунскімі спосабамі допытаў. Імперыя бальшавікоў дужа не любіла праўды, хавала свае злачынствы, катавала і карала іншадумцаў — усіх, хто не быў згодны крочыць у адной шарэнзе.

Вёска Юшкавічы — непрыкметная, утульная, у вэлюме зеляніны, у акружэнні ўзгоркаў. Такіх мясцін нямала ў азёрным краі. У гэтай вёсцы ў сакавіку 1950 года сябра падпольнай арганізацыі Генадзь Нафрановіч пры спробе арышту карнікамі застрэліўся з нагана.

...Лясная дарога запрашае ў густы хвойнік. З узгорка любуемся наваколлем, спакойнай плынню Віліі. Дзелавіта рыхтуе да здымак сваю кінатэхніку Валер Мазынскі. Менавіта яго рупнасцю і прафесійнай апантанасцю пабачыла свет адмысловая кінастужка «Расціслаў Лапіцкі».

Валер неаднаразова выязджаў у Польшчу, зняў і запісаў на стужку сведак і ўдзельнікаў падполля: сябра Расціслава Лапіцкага — Юзіка Качэргу ў Шчэціне, Леакадзію Цыбоўскую ў Сопаце, Зянона Ахрамовіча ў Эльблонгу і Зосю Лапіцкую ў Гіжыцку. Пасля зняволення яны з'ехалі з краіны «шчасця» на сталае жыхарства ў Польшчу.

З кожнай новай вандроўкі па азёрных мясцінах Валер Мазынскі прывозіць новыя кінадакументы.

...Па пакручастаму, у глыбокіх калдобінах лясному гушчарніку кіруемся да месца расправы над Расціславам Лапіцкім. Бетонныя глыбы, карэнні, ірвы, парослыя мохам, кустамі ядлоўцу. Дзе ж яно, тое месца, на якім абарвалася жыццё патрыёта бацькаўшчыны Расціслава Лапіцкага?

Міхась Чарняўскі спыняецца, твар спахмурнеў, цяжка на душы, ледзь чутна пачынае:

— Прывезлі сюды ў варанку смяротнікаў для расправы, для выканання прысуду — Расціслава Лапіцкага і Факунду Несцяровіча. Восеньская халодная ноч схавала чырвонапагонных катаў, вілейскі лес у трывожным чаканні. Чорныя справы вяршыліся ў чорнай ночы.

Зачыталі смяротны прысуд Несцяровічу. А затым «велікадушна» абвясцілі рашэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР пра памілаванне. Замест чэкісткай кулі будзеш паўжыцця катавацца ў Варкуталагу.

Затым абвясцілі «смяротнік» Лапіцкаму. Аднак пра памілаванне маўчаць, хоць яно ж мелася ў катаў. Чакалі, што смяротнік Лапіцкі кінецца на калені і будзе маліць карнікаў пра літасць. Не дачакаліся. Расціслаў маліцца катэгарычна адмовіўся. Грымнуў стрэл, юнак упаў. Факунду Несцяровічу загадалі засыпаць магілу яго сябрука Расціслава.

...Мы моўчкі стаім каля паўтонніка — валуна, на якім высечаныя слоўцы: тут расстраляны беларускі патрыёт Расціслаў Лапіцкі.

Хто ж той руплівец, які паставіў гэты знак-помнік?

Да змяркання вандруем па Занарачы, Некасецку, знаёмімся з мясцовымі, занатоўваем цікавыя прыгадкі. Прыветлівыя, добразычлівыя, гасцінныя людзі. Пачаставалі гасцей у вёсцы Позерцы разварыстай бульбай з сальцам і агуркамі са свайго агародчыка, не пашкадавалі на дарогу яблычкаў, грушак, сліў.

І зрабілася цёпла на душы. З гэтых мясцінаў, сярод такіх жа ціхмяных, гасцінных і працавітых людзей мацавалі свой дух, гартавалі волю Расціслаў Лапіцкі і яго сябры, асуджаныя судом ваеннага трыбунала.

***P.S.:*** *Развітальная паездка на Маладзечна. Музычная вучэльня імя М. Агінскага. Пампезны фасад будынка «аля Сталінскі ампір» 50-х гадоў. Імперыя падласці збіралася панаваць вечна. Чаму б мясцовым уладам не пазначыць «бронзай» на фасадзе, што ў гэтым будынку былога абласнога НКВД, у бетонных падвальных сутарэннях, «бушлатах»-катухах катавалі мядзельска-смаргонскіх падпольшчыкаў? Баялася імперыя вясковых юнакоў і дзяўчат.*

▸ ВЫСТАВА

# «БУДЗЬМА!» У ВАРАЦЭВІЧАХ

**Мастакі суполкі «Пагоня» аддалі даніну пашаны і памяці Язэпу Драздовічу, прысвяціўшы ягонаму 120-гадоваму юбілею адмысловую выставу «Нябесныя бегі — Вечны вандроўнік», якая вандруе амаль па ўсёй Беларусі.**

Напрыканцы снежня экспазіцыя дэманстравалася ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці, радзіме мастака Напалеона Орды ў мастацкай галерэі музейнага комплексу, які носіць яго імя. Потым пераехала ў Ліду. Выставу плануецца паказаць таксама ў Пінску, Паставах, Вілейцы і Полацку.

У экспазіцыі больш за 30 твораў жывапісу і графікі. Сярод іх палотны Уладзіміра Сулкоўскага, Ігара Марачкіна, Генадзя Драздова, Георга Скрыпнічэнкі, Ігара Бархаткова, Ягора Батальёнка — усіх не пералічыць.

На адкрыцці экспазіцыі ў Варацэвічах прысутнічалі вучні Іванаўскай мастацкай школы, якой кіруе сябра суполкі «Пагоня» Янка Рамановіч. Аляксей Марачкін, старшыня суполкі, правёў першую экскурсію па выставе, распавёў пра творчасць Язэпа Драздовіча, ягоны нялёгкі лёс, а таксама падрабязна спыніўся на творах, якія знаходзяцца ў экспазіцыі.

Пры адкрыцці выставы адбылася прэзентацыя культурніцкай кампаніі «Будзьма!». Аляксей Марачкін зрабіў кожнаму з удзельнікаў сустрэчы падарункі ад кампаніі «Будзьма», дзякуючы якой мастацкія выставы трапляюць у самыя аддаленыя ад сталіцы куточкі нашай краіны.

АСОБА

# Ігнат Даніловіч. З МІЛАСЦЮ ДА ГІСТОРЫІ

Яўген ГЛІНСКІ

**Першая палова XIX стагоддзя ў еўрапейскай грамадскай свядомасці была часам панавання рамантызму, што надаваў асаблівую ўвагу мінуўшчыне, у якой рамантыкі шукалі прыклады гераічнага жыцця. Многіх з былой Рэчы Паспалітай старадаўнія часы вабілі яшчэ і таму, што ў іх бачыўся росквіт дзяржавы, якая ў канцы папярэдняга стагоддзя была знішчана.**



Гісторыя зрабілася ў той час усеагульным захапленнем. Але сярод процьмы аматараў старажытнасцяў вылучаліся людзі, якія сваёй дзейнасцю здолелі зрабіць мінуўшчыну больш вядомай і зразумелай для сваіх сучаснікаў. Адным з такіх людзей быў Ігнат Даніловіч. Даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага нарадзіўся 30 ліпеня 1787 года ў сям'і уніяцкага святара Мікалая Даніловіча і Даміцэлі з Міхневічаў. Вёска Вялікія Грынявічы, дзе жылі Даніловічы, знаходзілася ля Бельска (цяпер у Польшчы) і па трэцім падзеле Рэчы Паспалітай першапачаткова трапіла ў склад Прусіі. Зрэшты, прускае падданства (а з 1807 года — расійскае) мала адбілася на паўсядзённым жыцці сям'і Даніловічаў. Адно падчас навучання ў Беластоцкай гімназіі Даніловіч вывучыў нямецкую мову, што дазволіла яму ў сталым веку пісаць гістарычныя працы і на ёй. Большае значэнне для маладога Ігната мела іншая мова, якая тады яшчэ не мела нават назвы, але шырока выкарыстоўвалася не толькі ў гутарцы, але і падчас казанняў ва уніяцкай царкве. Сам Даніловіч пасля назаве яе «польска-рускай», аднак была гэта беларуская мова, хоць для роднага Даніловічу Падляшша і са значным дамешкам украінскіх і польскіх слоўў. Веданне беларускай мовы спатрэбіцца Даніловічу для вывучэння гісторыі ВКЛ.

Але ўсё гэта здарыцца пазней, а пакуль у 1804 годзе Даніловіч, каб плаціць за вучобу малодшага брата, працуе хатнім настаўнікам. Ужо ў маладосці працавітасць і талент Даніловіча былі заўважаны: яго поспехі адзначаны школьнымі ўзнагародамі, а рэктар Ломжынскай школы Чарнецкі прызначыў яго настаўнікам.

## Правазнавец

Зацікаўленасці маладога настаўніка спачатку палягалі ў сферы юрыспрудэнцыі. Таму ў 1810 годзе ён паступае на факультэт маральна-палітычных навук Віленскага універсітэта. У Вільні бліскучыя здольнасці Даніловіча праявіліся ў поўнай меры. Ужо ў 1811 годзе ён стаў магістрам права. Вайна 1812 года прымусіла Даніловіча часова прыпыніць навуковую дзейнасць. Ён пераехаў у Беласток, бліжэй да сваёй малой радзімы, і пачаў працаваць сакратаром пры французскім губернатары. Такім чынам, у адрозненні ад свайго сябра Міхаіла Бабро ўскага, Даніловіч паўдзельнічаў у падзеях 1812 года і выразна акрэсліў сябе прыхільнікам аднаўлення Рэчы Паспалітай. Пасля вайны Даніловіч вярнуўся ў Вільню, дзе пачаў выкладаць на універсітэце мясцовае права. Ягоная навуковая кар'ера правазнаўцы развівалася паступова і дасягнула піку ў 1823 годзе, калі ён стаў прафесарам кафедры мясцовага права Віленскага універсітэта.

## Гісторык права

Правазнаўства па-ранейшаму цікавіла Даніловіча, але яшчэ з сярэдзіны 10-х гадоў ён адчуў большую цікавасць да гісторыі права, чым да практычнай юрыспрудэнцыі. Безумоўна, паўплывала на такі выбар эпоха рамантызму, якая зрабіла папулярным зварот да мінуўшчыны. Уплыў на Даніловіча мелі і яго сябры Ігнат Алдакоўскі і Яхім Лялевель, якія таксама ў гэты час звярнуліся да гісторыі права Польшчы і ВКЛ. Але ў адрозненні ад паляка Лялевеля Даніловіч і Алдакоўскі цікавіліся старажытнасцямі ВКЛ. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграла, мабыць, іх паходжанне: абодва нарадзіліся на тэрыторыі былога Вялікага княства. Сын уніяцкага святара, Даніловіч добра чытаў на старабеларускай мове, ягоныя вучні, многія з якіх былі таксама уніятамі, прывозілі яму з летніх вакацыяў стосы старабеларускіх манускрыптаў і друкаваных кніг.

У 1817–1819 гадах Даніловіч здзейсніў навуковае падарожжа, падчас якога працаваў у бібліятэках і архівах Варшавы, Пецярбурга, Масквы. Тады ж ён зрабіў сваё першае вялікае навуковае адкрыццё. У бібліятэцы канцлера Румянцава, вядомага мецэната і збіральніка старажытнасцяў, які між іншым дапамагаў беларускім навукоўцам Зарыяну Даленга-Хадакоўскаму і Івану Грыгаровічу, Даніловіч знайшоў збор законаў Казіміра Ягелончыка. Гэты помнік права XV стагоддзя лічыўся згубленым у сваім першапачатковым варыянце, а ў збор Румянцава трапіў з аднаго з расійскіх манастыроў, дзе быў названы «Судзебнікам Казіміра 1468 года». Даніловіч прапаноўваў назву «Статут Казіміра», але прыжылося найменне «Судзебнік».

У пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя Даніловіч ужо займаецца гісторыяй права ВКЛ стала. Разам з Алдакоўскім і Лялевелем ён рыхтуе да выдання Статуты ВКЛ, збор каралеўскіх і вялікакняскіх прывілеяў, уваходзіць у камісію, якая працуе над кодэксам мясцовых законаў былога ВКЛ.

## Гісторык летапісання

У 1822 годзе з вялікага падарожжа па Еўропе вяртаецца сябар Даніловіча па Віленскім універсітэце Міхаіл Бабро ўскі. Інтарэсы старых знаёмых супадалі. Абодва займаліся пошукам гістарычных крыніц часоў ВКЛ. Бабро ўскі паведаміў Даніловічу, што ў Супрасльскім манастыры знаходзіцца вялікая калекцыя старажытных тэкстаў. Даніловіч у гэты час вышукваў (як сам пісаў, «з немалымі цяжкасцямі») паасобнікі Статутаў. Відаць, ён спадзяваўся натрапіць на Статут і ў Супраслі. Але тут Даніловіча і Бабро ўскага чакала знаходка зусім іншага характару. Яны адшукалі спіс беларуска-літоўскага летапісу. Даніловіч ацаніў вартасць знаходкі. Ён пісаў, што знайшоў летапіс «дагэтуль нікому не вядомы». У гэтым ён меў рацыю, а сваёй знаходкай Даніловіч і Бабро ўскі паклалі пачатак даследаванню беларуска-літоўскага летапісання. Даніловіч правёў энергічную працу па прачытанню старажытнабеларускага тэксту і публікацыі яго лацінкай. Наш герой з апорай на знойдзены рукапіс рашуча выступіў супраць досыць распаўсюджанага ў пачатку XIX стагоддзя меркавання, што ў ВКЛ уласнага летапісання не вялося ці, прынамсі, што ўсе летапісы з ВКЛ згублены.

## Выгнанец

Але, як і ў выпадку з яго сябрамі Бабро ўскім і Лялевелем, навуковая праца Даніловіча ў Вільні была перарваная. А адбылося гэта так. Сярод студэнтаў Даніловіча было шмат дзеячаў таемных таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Сам Даніловіч, дзякуючы бліскучаму таленту лектара і навукоўца, быў вельмі папулярны сярод навучэнцаў. Пры гэтым ён не ўтойваў свайго замілавання гісторыяй ВКЛ. А калі ў 1824 годзе расійскія ўлады раскрылі дзейнасць таемных таварыстваў, Даніловіч, як і шэраг іншых выкладчыкаў, быў зняты з пасады. Яму, згодна з царскім загадам, было забаронена жыць на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Даніловіч прасіў пра літасць, у яго падтрымку выступілі многія навукоўцы, у тым ліку асабліва актыўна Іван Лабойка, які высока цаніў гістарычныя і правазнаўчыя працы Даніловіча. Але марна. Даніловіч мусіў пакінуць Вільню. Усё сваё жыццё ён будзе марыць вярнуцца, шукаць магчымасці для пераезду ў старажытную сталіцу ВКЛ, але забарону на вяртанне ў Вільню так і не здымуць. А ў 1824 годзе ягоны ад'езд выклікаў усеагульны смутак сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

Дзякуючы звароту Лабойкі да міністра адукацыі Шышкова, з Даніловічам абышліся даволі літасціва. Ён стаў выкладчыкам, а пасля дэканам факультэта ў Харкаўскім універсітэце, дзе працягваў актыўную навуковую дзейнасць. Як пісаў Яхім Лялевель, «Ігнат Даніловіч, выгнаны з Вільні, не быў страчаны для навукі, не пакінуў заняткаў Статутамі». У Харкаве ён запомніўся студэнтам бліскучымі лекцыямі.

## Укладальнік зводу законаў

Наступны паварот у жыцці Даніловіча адбыўся ў 1830 годзе. У Пецярбургу М. Сперанскі, які займаўся кадыфікацыяй законаў Расійскай імперыі, перайшоў да стварэння зводу законаў для тэрыторыі былога ВКЛ. У камісіі Сперанскага апынуўся Францішак Малеўскі, былы філамат і вучань Даніловіча. Малеўскі не забыў свайго настаўніка і параіў Сперанскаму запрасіць такога выдатнага знаўцу права ВКЛ для працы над зводам. Так Даніловіч апынуўся ў Пецярбургу. Ягоная праца над зводам законаў цягнулася 4 гады і была прызнаная яго расійскімі калегамі «цыклапічнай». Здавалася, Даніловіча ацанілі. Падрыхтаваны ім і іншымі супрацоўнікамі «Звод мясцовых законаў заходніх губерняў» нават быў надрукаваны. Даніловіч атрымаў магчымасць працаваць на універсітэце ў Кіеве. У гэты горад ён папрасіўся сам, бо хацеў даследаваць яго незлічоныя помнікі старажытнасці. Але ў чарговы раз расійская ўлада палічыла Даніловіча ненадзейным. Калі ў 1839 годзе ва універсітэце Кіева былі выкрыты таемныя таварыствы, Даніловіча, як і іншых прафесараў, што былі аднесеныя да палякаў, знялі з пасады. А ў 1840 годзе высветлілася, што прапала бясплённа і яго праца над заканадаўствам «заходніх» губерняў. Расійская ўлада наогул скасавала дзейнасць Статута на тэрыторыі былога ВКЛ.

Даніловіч у той час працаваў у Маскоўскім універсітэце. Нягледзячы на слабое здароўе, ён працягваў даследаванні беларуска-літоўскага летапісання, знайшоў дзве кнігі Метрыкі ВКЛ, публікаваў працы.

Але шматразовыя вымушаныя пераезды, падазронае стаўленне да яго расійскіх улад, немагчымасць займацца толькі ўлюбёнай яму навукай выклікалі ў Даніловіча нервовае захворванне. Даніловіч вымушаны быў пакінуць працу ва універсітэце. Не маючы магчымасці вярнуцца ў Вільню, ён накіраваўся ў Кіеў, а адтуль паехаў на лячэнне ў горад Грэфенберг у Сілезіі. Там выдатны даследчык і памёр 12 жніўня 1843 года.

## Сапраўдны навуковец

У тым жа 1843 годзе пабачылі свет «Кнігі пасольскія Метрыкі ВКЛ», знойдзеныя ў Маскве Даніловічам і выдадзеныя князем Абаленскім. Толькі ў 1860 годзе Ян Сідаровіч у Вільні выдаў «Скарбонку актаў». Гэта кніга была працай усяго жыцця Даніловіча. Ён пачаў збіраць выпіскі з гістарычных крыніц для ўкладання гэтага збору яшчэ з пачатку 20-х гадоў і назапашваў іх да сваёй смерці. Уявіць, якую велізарную працу зрабіў даследчык, можна, калі падлічыць колькасць гістарычных дакументаў, кароткі змест якіх перададзены ў «Скарбонцы». Такіх дакументаў 2383.

Магчыма, меў Даніловіч прамое дачыненне да ўкладання і выдання першай у XIX стагоддзі кнігі на беларускай мове. Гэта быў так званы «Катэхізіс» 1835 года, у якім яго ўкладальнік называе беларускую мову «польска-рускай», як і Даніловіч у сваіх працах. Зрэшты, нягледзячы на тое, што ён называў беларускую мову «польска-рускай», Даніловіч адрозніваў яе і ад польскай, і ад рускай, падкрэсліваў яе значэнне ў часы ВКЛ. Адзін з сучаснікаў Даніловіча Людвік Яноўскі так пісаў пра захапленне Даніловіча мінуўшчынай ВКЛ і мовай свайго народу: «Асабліва падабалася яму чытаць і тлумачыць старыя творы права і літоўска-рускія (беларуска-літоўскія — Я. Г.) хронікі, якіх старажытная мова ў ягоных вуснах прымала гукі народнай гаворкі, сухі спосаб выкладання рабіўся поўным яскравых і жывых фарбаў, і даўняя мінуўшчына ажывала ў цэлай сваёй старажытнай прыгажосці».

Адзін з біёграфаў Ігната Даніловіча А. Чаркас назваў яго «патрыётам-ліцвінам, грамадзянінам дзяржавы, якая даўно знікла, і чалавекам, які з міласці да помнікаў гісторыі служыў прывіду XV і XVI стагоддзяў». З такой характарыстыкай можна пагадзіцца толькі часткова. Сапраўдны патрыёт-ліцвін, Даніловіч служыў не «прывіду» даўно зніклай дзяржавы, ён аднаўляў гісторыю гэтай дзяржавы, каб народы, якія ў яе ўваходзілі, ведаючы яе слаўную гісторыю, маглі адрадзіць сваю дзяржаўнасць.

**Сваёй знаходкай Даніловіч і Бабро ўскі паклалі пачатак даследаванню беларуска-літоўскага летапісання. Даніловіч правёў энергічную працу па прачытанню старажытнабеларускага тэксту і публікацыі яго лацінкай**

▸ ЦІКАВА

# BYCAMP–2008: «КОЖНАЯ САКРАТАРКА МОЖА КІРАВАЦЬ ІНТЭРНЭТАМ»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**На наступным тыдні сайт газеты «Новы час» пачынае працаваць у новай версіі. Цяпер рэсурс будзе больш адпавядаць патрабаванням сучаснага інтэрнэту і, спадзяемся, зойме пачэсны пасад між іншымі электроннымі СМІ Беларусі. Хочацца адзначыць гэту падзею тэматычным матэрыялам і прадставіць чытачу справаздачу пра мерапрыемства, сведкай якога журналістка «НЧ» стала перад самымі калядна-навагоднімі вакацыямі. На базе Інстытута журналістыкі БДУ адбыўся першы беларускі баркэмп BYcamp–2008.**

Калі б «новы журфак» ці, па-афіцыйнаму, Інстытут журналістыкі Белдзяржуніверсітэта не быў падобны да бліскучага «Тытаніка», і яго выкладчыкі мелі больш шанцаў выпадкова трапіць з палубы для першага класу ў гулкія трумы неабжытых аўдыторый, яны, безумоўна, сабраліся б у зале, дзе праходзіла рэгістрацыя ўдзельнікаў «Байкэмпа» і хорам плакалі ад замілавання. Яшчэ б не плакаць прагрэсіўнаму беларускаму выкладчыку: сотні гаманкіх асобаў студэнцкага веку з палаючымі вачыма тоўпяцца каля раскладу і шумна выбіраюць, на якую пару пайсці! Больш за тое, палова з іх без прымусу падрыхтавала ўласную лекцыю! Карацей, моладзь усяляк праяўляе ініцыятыву ў навучанні і фактычна займаецца самаадукацыяй! Пануе атмасфера «Свята неслухаў» ці «Дня самакіравання» — мерапрыемства, якое час ад часу дазваляе беларускім вучням кіраўніцтва ліберальных навучальных установаў. Прыкладна такое ўражанне мог зрабіць «Байкэмп» на чалавека, непадрыхтаванага да таго, што ён пабачыць.




20 снежня на майцы намесніка дэкана Інстытута журналістыкі Аляксандра Градзюшкі можна было прачытаць, што ён не толькі дацэнт, к.ф.н. і выкладчык журфаку: «Я блогер!» — было напісана на яго майцы. Градзюшка быў ініцыятарам стварэння на факультэце новай спецыяльнасці — «Вэб-журналістыка» і актыўна спрычыніўся да арганізацыі канферэнцыі з боку адміністрацыі універсітэта. Мы папрасілі яго пракаментаваць мерапрыемства, якога ён чакаў не менш за астатніх яго ўдзельнікаў:

— Для беларускай журналістыкі «Байкэмп» — крок наперад. Я ганаруся, што менавіта ў нашым інстытуце адбыўся такі карысны абмен досведам паміж практыкамі ў IT-сферы. Перакананы: за электроннымі СМІ — будучыня. Я гляджу на гэта і як выкладчык: першакурснікі з нашай спецыяльнасці сталі актыўнымі ўдзельнікамі не-канферэнцыі. Мяркую, студэнт павінен вучыцца сам. Пазанавуковая праца — толькі так можна навучыць вэбтэхналогіям. Баркэмп вучыць актыўнасці — пасіўны, безыніцыятыўны студэнт не варты нічога.

## Баркэмп як фармат

Ён быў прыдуманы ў 2005 годзе ў ЗША, у — хто б сумняваўся — Крэмніевай даліне. Каб паўдзельнічаць у не-канферэнцыі, не трэба занурацца ў навуковыя крыніцы і праводзіць грунтоўныя доследы — варта проста сабраць «падножную» інфармацыю і аформіць яе ў кароткую прэзэнтацыю. А можна і ўвогуле прыйсці з пустымі рукамі. Проста таму, што тэмы баркэмпаў — найшоўшыя з'явы тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу, якія яшчэ не трапілі ў падручнікі. Сабраўшыся разам, людзі, зацікаўленыя ў нейкай вузкай тэме, у нефармальнай абстаноўцы абменьваюцца досведам, дзеляцца напрацоўкамі з калегамі. Крутыя спецыялісты прыроўненыя ў правах да пачаткоўцаў. Хоць нагодай для баркэмпаў зазвычай робіцца тэмы, блізкія да інтэрнэту, баркэмп можа стаць спосабам спасціжэння чаго заўгодна.

Тэматыка першага беларускага Байкэмпа была акрэсленая даволі шырока: «новыя медыя, блогінг, падкастынг, сацыяльныя сеткі, бяспека ў інтэрнэце і стартапы (кампаніі, што толькі пачынаюць бізнес)». Карацей, было ясна: BYcamp–2008 мае антураж «першага бліна комам» і яго асноўная задача — пашырыць цікавы фармат на беларускія землі і перазнаёміць людзей з супольнымі цікаўнасцямі. Ніхто і не спрабаваў хаваць: самымі галоўнымі падзеямі Байкэмпу сталіся вечарынкі, арганізаваныя ў канцы кожнага дня ў мінскіх клубах. Дапамога некаторых блогераў у правядзенні не-канферэнцыі выявілася ў тым, што яны сыгралі для кэмпераў сваю музыку.

## Філасофія баркэмпу

— Кожны яго ўдзельнік — адначасова арганізатар. У некалькіх памяшканнях адбываецца да 100 прэзентацый паралельна. Іх графік складаецца «усім мірам»: важна паспець упісаць на дошку сваю тэму, пакуль не набеглі іншыя аратары. Потым удзельнікі выпісваюць найцікавейшае і пачынаюць вандраваць з залы ў залу для спажывання новых ведаў. Хаця што я такое кажу? Хто ў наш час піша? Дошку дружна фатаграфуюць на мабільныя тэлефоны.

Падчас звычайных самітаў, «круглых сталоў» і іншых пленарных пасяджэнняў, таварыства «чотка» падзяляецца на «прэзідыум», «залю» ды «прэсложу». Падчас баркэмпу такія падзелы немагчымыя. «Мы праводзім прэс-канферэнцыю ў фармаце прэзентацыі — «слота». 20 хвілін мы расказваем, 10 хвілін вы задаяце пытанні, а потым нас адсюль высяляе наступная група», — заяўляе журналістам Ната Ісаевіч: яна тут нехта накшталт «народнага прэс-сакратара». Падчас адной з прэзентацый абмяркоўваецца тое, як хутка баркэмп-рух пашырыўся ва Усходняй Еўропе і Азіі. У 2007–2008 гадах інтэрнэтчыкі СНД сустракаліся ў Бішкеку, Рызе і двойчы ў Кіеве. Вялікія і малыя баркэмпы праводзіліся ў лесе, піянерлетніках... «А вось падчас медыякэмпа ў Клайпедзе ў 400 метрах ад стаянкі было мора, а на стаянцы — «вайфай»... Усё, пра што можна марыць! — летуценна згадвае актывіст Байкэмпу Ігар Кандыба — Хто яшчэ з прысутных быў там?» Дзяўчына, якая бярэ тэлеінтэрв'ю ў прадстаўніка кампаніі «Opera», кідае камеру і пачынае скокаць і махаць рукамі: «Я! Я там была!» Вось і я, зарэгістраваўшыся як шараговы ўдзельнік, абсалютна выпадкова даведалася шмат карыснага: напрыклад, цяпер я ўдвая хутчэй працую з браўзерам «Opera», які ўжо пяць год як усталяваны на маім кампутары.

Паводле падлікаў рэгістрацыйнай каманды, удзел у «Байкэмпе» ўзялі 202 чалавекі, якія прадставілі больш за 30 прэзентацый. Хаця смела можна памножыць гэтую лічбу ўдвая: абмеркаванні самых цікавых тэм працягваліся ў калідорах, а пасля і ў інтэрнэце.

## Афіцыйна

Ніякай не-канферэнцыі ў Мінску не было: «Байкэмп» праходзіў «па дакументах» як самая звычайная канферэнцыя. І толькі на другі яго дзень рабілася зразумелым, што ў слове «баркэмп» могуць значыць першыя тры літары: праца малых груп адбывалася адначасова ў некалькіх мінскіх кавярнях. У кавярні «Шакаладніца» абмяркоўвалі перспектывы онлайн-журналістыкі. Група адразу падзялілася на тых, хто чагосьці не ведаў, і тых, хто меў вялікую ахвоту чамусьці навучыць. «Я спрабую раскруціць рэсурс для маладых бацькоў, але пакуль не выходзіць», — прызнаецца паненка. — «А як ён называецца?» — «Майлайф.бай» — «Ну канешне ж! Якая ж гэта назва для дзіцячага сайту? Варта павучыцца ў канкурэнтаў. Напрыклад, «Дзеткі.орг»!». «Я хачу стварыць свой партал навінаў, але ў мяне няма грошай на дызайн», — дзеліцца бядой наступны кэмпер. — «Чаго прасцей!» — яму дыктуюць адрас, дзе абсалютна бясплатна можна ўзяць макет сайту і адразу вучаць рэдагаваць яго. «Сёння кожная сакратарка можа за дзень стварыць сайт кампаніі і навучыцца адміністраванню»... Праца ў малых групах плаўна перацякае ў выніковую вечарынку.

## Вынік

BYcamp–2008 — безліч станоўчых эмоцый у тых удзельнікаў, якія настройваліся на пазітыў, і мора блог-аналітыкі з боку тых, хто завітаў пашукаць недахопы. Зрэшты, як слушна сказаў адзін з арганізатараў, «немагчыма стварыць баркэмпу кепскую рэпутацыю: гэта значыць, што ты — сам такі, бо канферэнцыя такая, якой яе робіш ты». Галоўнае, насуперак скептыкам, энтузіясты беларускага вэбу давялі: баркэмпы магчымыя ў Беларусі. Чакаецца працяг вэб-банкету. А яшчэ ёсць задума правесці ў 2009 «мовакэпм», прысвечаны моўнай сітуацыі ў Беларусі.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2007.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 16.01.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.